

СКАРАЦІЦЬ ШЛЯХ УНУТРЫ САЮЗА

МС

ЯК ГОРКІ ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ БІЗНЕС

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛІПЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 129 (28996)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Урад гатовы завяршыць перагаворы па далучэнні Беларусі да Сусветнай гандлёвай арганізацыі да 12-й міністэрскай канферэнцыі СГА ў чэрвені 2020 года. Наша краіна з'яўляецца найбольшай эканомікай з усіх актыўных краін, якія далучаюцца, таму зыходзіць з таго, што далучэнне Беларусі выгаднае ўсім членам СГА і самой арганізацыі».*

# ПАМІЖ ЧАРНІЦАЙ І ЧАРНІЧКАЙ



У Докшыцкім раёне ў разгары нарыхтоўчы сезон дзікарослай прадукцыі. На лясной дарозе паміж вёскамі Чарніца і Чарнічка працуюць некалькі нарыхтоўчых пунктаў, у якія мясцовае насельніцтва здае сабраныя ягады і грыбы. Мне давялося зрабіць фотаздымак у пункце Васіля ЗЯЛЁНКІ — жыхара Докшыц, старاннага і ветлівага нарыхтоўшчыка з сямігадовым стажам. Зранку да вечара Васілю нясуць і прывозяць чарніцы і лісічкі з навакольных лясоў. Вось і Аляксандр АПАНАСЕВІЧ, жыхар вёскі Таргуны ў час адпачынку таксама збірае лясныя дары і здае Васілю Зялёнку *(на фота)*.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Больш за 500 лясных пажараў адбылося ў Беларусі з пачатку года.**

• Піраміда з аўтамабіляў утварылася пры ДТЗ у Мазыры. У крыві вінаватага ў аварыі кіроўцы легкавушкі выяўлена 1,7 праміле алкаголю.



• **Вярхоўная рада Украіны прыняла закон аб прымусовай хімічнай кастрацыі педафілаў.**

• КХЛ апублікавала поўны каляндар чэмпіянату-2019/2020.

• **БДУІР павялічвае набор на папулярныя IT-спецыяльнасці.**

• БЧ прызначыла дадатковы цягнік у Вільнюс. Ён адпраўляецца з Мінска ў 13.50 і прыбывае ў Вільнюс у 17.00. Назад у Мінск адпраўляецца ў 12.40 і прыбывае ў 15.50.

ISSN 1990 - 763X
19129>

Базарны дзень

## МАСТАЦКІ КАКТЭЙЛЬ У ВІЦЕБСКУ

**Дождж і сонца, безліч фарбаў і нот, жыта і валошкі, народныя строі і футурыстычныя касцюмы, новае папулярнае месца для сэлфі — «глобус Віцебска» і клумба-раяль каля Летняга амфітэатра — усё гэта неад'емныя складнікі XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Афіцыйна ён стартаваў учора позна ўвечары, аднак першыя аншлагавыя канцэрты і дзіцячы конкурс стартавалі яшчэ на некалькі дзён раней.**

СТАР. 2




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Фінансавы выдатнік

## КАЛІ ТРЫ ЯШЧЭ НЕ ЗАШМАТ

### Колькі можна рэальна зарабіць, калі купляць прадукты оптам?

**Стаўленне нашага спажыўца да цэн на прадукты часцей за ўсё адмоўна-нярвовае. Мы эмацыянальна не гатовыя плаціць за ежу вялікія грошы. Хто сказаў, што эканоміць на страўніку нельга? Яшчэ як можна і нават трэба. Але рызыкнём перайсці ад эмоцый да лічбаў і высветлім, ці можна менш выдаткоўваць на прадукты не за кошт якасці ежы ў талерках.**

### ТАМ ПРАПАНУЮЦЬ ТАННЕЙ

Прадукты харчавання — гэта не валюта і не паліва. Нават абсалютна аднолькавы глазураваны сырок у розных прадаўцоў часам рэалізуецца па вельмі розных цэнах. Не будзем апісваць увесь харчовы рынак, але нагадаем некаторыя важныя моманты.

Па-першае, рознічныя крамы абавязкова робяць нацэнку да закупачнай цаны тавараў. Звычайна гэта ад 20 % да 50 %, а часам і больш. У многіх вытворцаў ёсць крамы фірменнага гандлю. Нацэнка ў іх першапачаткова ніжэйшая — вагаецца ад 5 % да 15 %, што робіць пакупкі там больш выгаднымі. Яшчэ ёсць аптовыя рынкі, крамы і шапікі. Бывае, што дабірацца да іх далёка, ды і іншы сэрвіс там не на вышыні, але затое яны ставяць мінімальную надбаўку да цаны і зарабляюць на абароце. Акрамя таго, існуюць сезонныя акцыі, кірмашы, часовыя зніжкі, распродажы і іншыя варыянты.

СТАР. 3

# МАСТАЦКІ КАКТЭЙЛЬ У ВІЦЕБСКУ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Гэты год напоўнены для нашай краіны яркімі падзеямі — у прыватнасці, зусім нядаўна фінішаваў буйны мультыспартыўны форум, II Еўрапейскія гульні, — нагадаў на першай прэс-канферэнцыі фестывалю **віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** — І па маіх адчуваннях, той дух еднасці і сяброўства, які панаваў на Гульнях, фактычна пераехаў з беларускай сталіцы ў фестывальную».

У параўнанні з мінулымі гадамі, арганізатары паклапаціліся аб тым, каб прыцягнуць да мастацкага форуму як мага большую ўвагу замежных гасцей, — а таму ў тэрмін з 1 да 20 ліпеня для грамадзян амаль 80 краін свету дзейнічае бязвізавы рэжым праз усе пункты пропуску, дастаткова толькі прад'явіць білет на любое мерапрыемства «Славянскага базару». Такі крок, на думку Ігара Петрышэнкі, стаў стымулам для таго, каб на фестываль прыехалі дадатково звыш пяці тысяч гасцей.

На думку **міністра культуры Юрыя БОНДАРА,** фестываль заслугоўвае таго, каб у будучым на ват на навуковай аснове ацаніць і даследаваць яго ўнёсак у развіццё беларускай культуры. Ды і не толькі беларускай: дзякуючы даросламу і дзіцячаму музычным конкурсам геаграфія мастацкага форуму ахапіла ўжо 75 краін!

### ФЭСТ У ЛІЧБАХ...

За без малога 30 гадоў правядзення «Славянскага базару» яго гасцямі і ўдзельнікамі стала каля 170 тысяч артыстаў, прадзюсараў і журналістаў з розных краін, а больш чым 5,5 мільёна гледачоў убачылі знакавыя мерапрыемствы і падзеі.

На сёлетнім фэсце працуюць 23 пляцоўкі, дзе запланавана правесці 190 мерапрыемстваў. Дарэчы, на канцэрты, спектаклі і выстаўкі, якія адбываюцца ў межах «Славянскага базару», ужо прададзена звыш 67 тысяч білетаў! Тыя ж, хто не ўбачыць гэтыя падзеі на свае вочы, прачытаюць, паслухаюць або паглядзяць на іх у шматлікіх рэпартажах і трансляцыях — на форуме працуе больш як 350 беларускіх і замежных журналістаў.

Адзіная лічба, якая сёлета, на жаль, аказалася менш за запланаваную, — колькасць удзельнікаў конкурсу маладых выканаўцаў «Віцебск-2019». Як расказаў кіраўнік «Славянскага базару» Глеб Лапіцкі, канкурсанты з Кубы і Славеніі «ў сувязі з юрыдычнымі нюансамі, і некаторымі пытаннямі па стане здароўя» датэрмінова выбылі з творчага спаборніцтва. Аднак яны застануцца гасцямі фестывалю і змогуць ацаніць гасціннасць беларускай публікі і падтрымаць іншых маладых артыстаў.

### РЫТМАХ...

Пад барабанны дробат, духавы аркестр і ўспышкі фотакамер ад плошчы Свабоды да плошчы Перамогі прайшло больш за 700 удзельніц III міжнароднага фестывалю-конкурсу барабаншчыц і мажарэтак. Сярод удзельніц ад Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана — як зусім маленькія дзяўчаты, так і пажылыя, але вельмі бадзёрыя жанчыны. «Ці не холадна?» — на бягу пытаемся ў госці з Цвярской вобласці Расіі. — «Горача!» — звонка рапартуе дзяўчынка.

На плошчы Перамогі, дарэчы, горача будзе ўвесь тыдзень: тут пройдзе пяцідзённы опэн-эйр, насычаны самымі разнастайнымі падзеямі, ад прадстаўленняў фэсту вулічнага мастацтва «На сямі вятрах» і канцэртаў папулярных беларускіх гуртоў да фестывалю кавер-бэндаў, чэмпіянату па аўтагуку і выставы класічных рэтра-аўтамабіляў.

А 14 ліпеня тут пройдзе, магчыма, самая маштабная ў Беларусі зарадка, на якую чакаюць каля 1000 удзельнікаў, у тым ліку вядомага музычнага педагога Святлану Стацэнку, удзельніцу «Еўрабачання-2019» Зену і папулярную ў падлеткаў блогера Ілону Камоську. З такой незвычайнай размінкі пачнецца новае для «Славянскага базару» мерапрыемства — міжнародны танцавальны батл Dream Dance Fest, на якім 12 гадзін бесперапынна будзе гучаць музыка, а танцоры з розных краін, ад Арменіі і Беларусі да Кітая і Грэцыі, пакажуць свае ўменні і дадуць усім ахвотным майстар-класы па харэаграфіі.

### УЗНАГАРОДАХ

Учора на небасхіле так званай «Плошчы зорак» каля Летняга амфітэатра прыбыло: новая зорка запалілася ў гонар народнай артысткі Украіны Таісіі Павалій, якая ў 1993-м заваявала ў Віцебску Гран-пры на II міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні (першы Гран-пры ў гісторыі фэсту), а ў 2010-м — сама ўзначальвала журы конкурсу маладых выканаўцаў.

Сёлета ж яна стала ўладальніцай іменнай зоркі і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Раней, нагадаем, гэту высокую ўзнагароду атрымлівалі ансамбль «Песняры», Ігар Лучанок, Ала Пугачова, Аляксандра Пахмутава і іншыя вядомыя дзеячы культуры.

«Я хвалююся, як у тым далёкім 1993 годзе, — прызналася Таісія Мікалаеўна. — Ведаеце, ва ўсіх інтэрв'ю расказваю, што Беларусь — мая творчая радзіма, і я шчыра, ад усяго сэрца так лічу, бо «Славянскі базар» — той фестываль, які адкрыў мне дарогу на вялікую сцэну. Шчыра дзякую, любімая, родная Беларусь!»

За некалькі гадзін да ўрачыстай цырымоніі адкрыцця «Славянскага базару — 2019» былі падведзены вынікі і ўручаны ўзнагароды найлепшым сярод 21 удзельніка дзіцячага міжнароднага музычнага конкурсу «Віцебск-2019». Пераможцай стала прадстаўніца нашай краіны Ксенія Галецкая. Падрабязней раскажам пра гэта і павіншуем юных артыстаў у наступным рэпартажы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК,**
*г. Віцебск.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пуцін назваў умову сустрэчы па Данбасе

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў пра гатоўнасць сустрэцца са сваім украінскім калегам Уладзімірам Зяленскім і абмеркаваць з ім сітуацыю ў Данбасе, але толькі пасля таго, як у Кіеве будзе сфарміраваны Кабмін, перадае ТАСС.

«Больш-менш пра штосьці можна будзе казаць пасля канчатковага фарміравання новага ўрада Украіны і правядзення выбараў у парламент краіны», — адзначыў кіраўнік расійскай дзяржавы.

У той жа час, адзначыў Пуцін, ён не ведае, як адрэагуюць на такую ініцыятыву іншыя ўдзельнікі прапанаванага фармату. Гаворка ідзе пра пасрэдніцтва на саміце прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, канцлера Германіі Ангелы Меркель, прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Тэрэзы Мэй і французскага лідара Эмануэля Макрона.

Датэрміновыя парламенцкія выбары ва Украіне пройдуць 21 ліпеня.

Раней стала вядома, што расійскі лідар зацікавіўся прапановай Зяленскага аб сустрэчы ў Мінску з нагоды ўрэгулявання канфлікту на тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей.

Украінскі прэзідэнт прапаноўваў Пуціну сустрэцца 8 ліпеня. У якасці пляцоўкі для саміту ён прапанаваў беларускую сталіцу і сказаў, што гатовы абмеркаваць, «чый Крым і каго там няма на Данбасе». Кіраўнік украінскай дзяржавы запрасіў для ўдзелу ў перамовах у якасці пасрэднікаў шэраг заходніх лідараў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову свайго ўкраінскага калегі і выказаў гатоўнасць падрыхтаваць сустрэчу на вышэйшым узроўні. МЗС Вялікабрытаніі таксама станоўча ацаніла ініцыятыву Зяленскага.

### Паўночная Карэя памяняла ўладу

Лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын стаў афіцыйным кіраўніком краіны пасля ўнясення папраўак у Канстытуцыю. Пра гэта паведамляе ТАСС.

Адзначаецца, што згодна з 100-м артыкулам абноўленага галоўнага закона, «старшыня Дзяржаўнага савета КНДР з'яўляецца яе вярхоўным лідарам, які прадстаўляе дзяржаву». Гэты пост займае Кім Чэн Ын. Да гэтага фармальным лідарам краіны быў старшыня прэзідыума Вярхоўнага народнага сходу (з красавіка гэта месца займае Цой Рэн Хэ).

Да 2016 года Кім Чэн Ын насіў тытул вышэйшага кіраўніка, лідэра партыі, арміі і народа КНДР, Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Карэйскай народнай арміі, маршала КНДР, дэпутата Вярхоўнага народнага сходу КНДР, Трэцяга сына Кім Чэн Іра і Вялікага нашчадка. Затым ён узначаліў яшчэ і Дзяржаўны савет.

### Расія абагнала Еўропу па росце цэн на жыллё

У першым квартале 2019 года цэны на жыллё ў еўразоне і на тэрыторыі Еўрапейскага саюза павялічыліся на 4 % у параўнанні з паказчыкам за аналагічны перыяд 2018-га. Пра гэта сведчаць даныя, апублікаваныя Статыстычнай службай ЕС (Еўрастат).

Па падліках аналітыкаў, за тры першыя месяцы 2019 года сярэднія цэнавыя паказчыкі на еўрапейскім рынку нерухомасці выраслі на 0,3 %. У гадавым вылічэнні больш за ўсё падаражэла жыллё ў Венгрыі (11 %), Чэхіі і Партугаліі (9 %). Зніжэнне цэнніка зафіксавана толькі ў Італіі — на 0,8 працэнта.

У Расіі, паводле інфармацыі Domofond.ru, толькі за студзень і люты сярэдні кошт квадратнага метра новых кватэр вырас на 3 %. На другасным рынку гадавы рост (у перыяд з сакавіка 2018-га да сакавіка 2019-га) склаў амаль 9 %.

На рынку нерухомасці Маскоўскага рэгіёна «квадрат» новага жылля за год да красавіка 2019-га года падаражэў у сярэднім на 10 % (даныя ЦІАН). «Другасны рынак» за названы перыяд дадаў 11 % у Маскве і 10 % у Маскоўскай вобласці.

### Гіганцкі кактус наскрозь прабіў Infiniti G35



Незвычайная аварыя адбылася ў штаце Арызона. Амерыканец на Infiniti G35 на хуткасці ўрэзаўся ў кактус Карнэгі. Гэта расліна, вядомая таксама пад назвай Сагуара, можа дасягаць у даўжыню 15 метраў і важыць некалькі тон.

Мужчына за рулём японскага купэ, знаходзячыся, верагодна, у стане ап'янення, перастроіўся цераз некалькі радоў і выехаў на раздзяляльную паласу, пасля чаго дапусціў сутыкненне з кактусам. Ад удару расліна зламалася і літаральна праткнула аўтамабіль наскрозь, выбіўшы лабавое шкло.

Па шчаслівым збегу абставін, аўтамабіліст атрымаў толькі некалькі нязначных траўмаў.

Яшчэ адно незвычайнае ДТЗ адбылося на днях у штаце Каларада. Дзікі мядзведзь забраўся ў прыпаркаваны Subaru і ўмудрыўся знішчыць аўтамабіль з ручніка. Машына праехала каля 30 метраў і ўрэзалася ў дрэва.


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже конторы лесничества, принадлежащего ОАО «Доломит»**

**Лот № 1.** Контора лесничества, инв. № 200/С-85760. Площадь — 230,4 кв. м. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, пер. Центральный, 10. **Начальная цена, бел. руб.** — 21 120,00 с НДС. **Задаток, бел. руб**. – 2 200,00. **Шаг аукциона** – 5 %.

**Земельный участок** площадью 0,1651 га с кадастровым номером 240155400001000317. Право аренды. Срок действия по 12.03.2059

**Обременение:** договор аренды от 30.04.2012 № 244 (площадь – 51,0 кв. м), действует до перехода права собственности.

**Условия аукциона:** 1. Подписать договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. 3. Оформить правоустанавливающие документы на пользование земельным участком в течение 30 календарных дней после подписания акта приема-передачи

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 4 000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 12.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Доломит», 211321, г. Витебск, ул. Центральная, 23, тел. 8 (0212) 69-19-49. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, г. Минск. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 12.08.2019 (ОАО «Доломит», лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, 3 этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 08.08.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Контактное лицо для осмотра Объекта: Григорьев Владимир Александрович, тел. 8 (0212) 69-81-66.

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже торгово-складской базы, принадлежащей ОАО «МИНСККОНТРАКТ» (продавец)**

Лот № 1. Торгово-складская база: 1. Магазин с инв. № 610/С-43874, 1973 г. п. Площадь 618,2 кв. м. 2. Здание склада с инв. № 610/С-43843, 1985 г. п. Площадь 876 кв. м. 3. Здание гаража с инв. № 610/С-43844, 1973 г. п. Площадь 80,3 кв. м. Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 2А, 2А/ 1, 2а/3. Обременения: аренда. Части здания склада с инв. № 610/С-43843 сданы по договорам аренды: — 198,00 кв. м по 31.01.2022; — 138,5 кв. м по 31.01.2022. Земельный участок: площадь 0,3442 га, кадастровый номер 640400000014000250. Право постоянного пользования.
Начальная цена с НДС — 401 436,00 бел. руб. Задаток — 45 000,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.
Аукцион состоится **08.08.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 08.08.2019 (лот № 1, ОАО «МИНСККОНТРАКТ»). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений — 06.08.2019 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.03.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Фінансы

# Вось і прыйшла дэфляцыя

## У нашай краіне ўжо традыцыйна ў пачатку лета назіраецца зніжэнне цэн

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў чэрвені гэтага года ў параўнанні з маем склаў 99,9 %, са снежнем мінулага года — 102,9 %. Сёлета гэта першы раз, калі цэны знізіліся. Папярэдні раз дэфляцыя ў нас была ў ліпені мінулага года.**

У маі цэны на харчовыя тавары знізіліся на 0,4 %. Нехарчовыя тавары не змяніліся ў цане (з пачатку года падаражэлі на 2,3 %), а паслугі падаражэлі на 0,4 %.

Сярод прадуктаў харчавання найбольш адчувальна патаннелі свежая белакачанная капуста (на 55,65 %) і свежыя агуркі (на 45,49 %). Цана знізілася і на свежыя памідоры, салодкі перац, рэпчаты лук. У цэлым гародніна патаннела на 26,85 %. Падаражэлі бульба (на 54,99 %), буракі (на 22,54 %) і морква (на 13,75 %). У цэлым прадукты харчавання і безалкагольныя напоі патаннелі на 0,62 %. Тытунёвыя вырабы сталі даражэйшыя на 0,38 %, алкагольныя напоі — на 1,2 %.

Нагадаем, што ў маі інфляцыя склала 0,3 %. Па планах урада, сёлета цэны павінны вырасці не больш чым на 5 %. Разам з тым інфляцыйныя чаканні насельніцтва па-ранейшаму высокія. Толькі 20 працэнтаў беларусаў лічыць, што ў найбліжэйшыя 12 месяцаў цэны будуць расці павольней, чым цяпер. Астатнія апытаныя Нацыянальным банкам упэўненыя, што інфляцыя застанецца на цяперашнім узроўні.

Сёлета ў маі ў нашай краіне з'явіўся экспертны савет па пытаннях цэн і тарыфаў, у які ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Нацбанка, Белстата і прафсаюзаў. У першую чаргу гэты савет будзе прыглядацца да цэн на жыллёва-камунальныя паслугі, на бензін, сувязь і праезд у грамадскім транспарце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# КАЛІ ТРЫ ЯШЧЭ НЕ ЗАШМАТ

### ЭКАНОМІМ 30—40 % НА АБ'ЁМАХ І РАСПРОДАЖАХ

Звычайны чалавек купляе прадукты аптовымі партыямі вельмі рэдка, хіба што на вялікіх святах. Але ведаць аптовыя цэны ўсё роўна карысна. Гэта менавіта тая мяжа, да якой могуць патаннець тавары ў розніцы на распродажах і акцыях.

Падглядзім аптовыя цэны на сайце аднаго спецыялізаванага магазіна. Адразу мы глядзім на «гарачыя» пазіцыі — гэта цукар. Кілаграм вышэйназванага прадукту сёння тут каштуе ад 98 капеек. Яйка курынае ў опце — ад 75—80 капеек за 1 дзясятак, а ў інтэрнэт-краме — дакладна такія ж яйкі той жа фабрыкі — 1,99 рубля за дзясятак (а вось па акцыі — ужо 1,09 рубля). Кілаграм блокавай мароaccess жанай ялавічыны прапануецца ад 3 да 9 рублёў, а кіло тушкі курыцы — за 3 рублі 15 капеек. Спіс можна працягнуць, аднак цэны опту заўсёды будуць прыкметна ніжэйшыя за розніцу. Ці можа любы ахвотны купіць прадуктаў ці гаспадарчых тавараў па аптовых цэнах? Не ўсё, не заўсёды, але можа. Некаторыя аптовыя фірмы маюць сваю розніцу, дзе прадаюць тавары з мінімальнай нацэнкай. Часам па цане вытворцы, так, як самі набываюць тавар са зніжкай ад завадской цаны.

*— Неяк раз па тэлевізары паказвалі перадачу аб японскіх хатніх гаспадынях, — расказвае пенсіянерка Святлана А. — Дык вось яны купляюць прадукты разам на аптовых базах. А мы чым горшыя? Мы з суседкамі часта кааперуемся, калі трэба купіць, напрыклад, цукар. Купляем на пяцярых 50-кілаграмовы мяшок цукру. Кожнай гаспадыні кілаграм абыходзіцца значна танней.*

На аптовых базах і рынках мае сэнс купляць прадукты, якія ў гаспадарцы патрэбныя пастаянна і тэрмін прыдатнасці якіх вытрымае пару-тройку месяцаў захавання. Акрамя цукру і мукі, на «аптоўцы» можна ўзяць скрынку сланечнікавага алею, чай, крупы. А вось затарвацца замарожанымі прадуктамі не варта, нават калі аптовыя цэны вельмі пабабныя.

*— Неяк раз я ўзяла пяць пачкаў замарожаных курыных катлет, у іх заканчваўся тэрмін рэалізацыі, і прадавец аддаваў амаль дарма, — успамінае Святлана. — І вось аднойчы ў нас у доме на цэлы дзень адключылі электрычнасць. Было лета. Халадзільнік пацёк, і да вечара ўсе гэтыя катлеты ператварыліся ў смярдзючую масу.*

Ёсць аптова-рознічныя крамы нізкіх цэн, у якіх усё проста, часам бедна з раснастайнасцю, але вельмі танна. Некаторыя прадукты тут на 30 %—40 % таннейшыя, чым у многіх сталічных крамах.

### ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ І НІЯКІХ ЭМОЦЫЙ

Ці выгадна купляць оптам у звычайных гіпермаркетах і крамах? З пункту гледжання арыфметыкі — выгадна, але не асабліва. У традыцыйным гандлі ёсць зніжкі для пастаянных пакупнікоў, але звычайна гэта некалькі працэнтаў па дысконтных картах. Аднак ёсць акцыі, распродажы, «тавары дня» і мноства іншых «смачных плюшак». Падчас акцый актуальна ўсё напісанае вышэй пра аптовыя крамы.

Найважнейшае абмежаванне аптовых пакупак заключаецца ў тым, што так можна набываць толькі прыдатныя да працяглага захоўвання прадукты. Гэта мяса (пры наяўнасці маразільнай камеры), кансерваваныя прадукты, крупы і крупяныя вырабы, моцныя спіртныя напоі і віно. Пра запас варта купляць тыя тавары, якія звычайна купляюць разам з прадуктамі. Гэта туалетная папера, аднаразовы посуд, бытавая хімія і іншае.

Аднак, калі два літры соку прадаюцца па цане паўтара літра, а сям'я выпівае толькі адзін літр, а астатняе псуецца і выліваецца, то гэта не эканомія, а відавочная страта. Тое ж датычыцца ўсіх скорапсавальных тавараў. Таму не варта купляць оптам садавіну, напоі (калі за акном не спякотнае лета, а ў вас у кватэры не шматдзетная сям'я), агародніну, хлебабулачныя вырабы і многія мясныя паўфабрыкаты.



Важная перавага аптовых закупак — яны часцей робяцца не па настроі, а па спісе. А планаванне асабістых фінансаў, як сцвярджаюць эксперты Нацбанка, эканоміць ад 15 да 50 % сродкаў у параўнанні са спантанымі пакупкамі.

У чым жа мінусы аптовых закупак? Яны ёсць, але, па большай частцы, не ў галіне фінансаў. Па-першае, аптовая купля прадуктаў — гэта абмежаванне рацыёну. У опце складаней сабраць асартымент далікатэсаў. Такая масавая купля — гэта выдаткі на захоўванне: маразільная камера, шафа і многае іншае. Па-другое, запас прадуктаў пазбаўляе мабільнасці. З ім нязручна пераязджаць, ехаць у адпачынак, на дачу. І яшчэ адзін важны недахоп, пра які рэдка гавораць, — аптовы шопінг — задавальненне такое ж бледнае, як аптовы склад на фоне гіпермаркета. Ні прыгажосці вітрын, ні заляцання прадавачак, ніякага глянцу табе, суцэльны разлік.

### ДЛЯ СЯРЭДНЯГА КЛАСА

*— Мне заўсёды здавалася недарэчнай парада паесці перад паходам у краму, — дзеліцца са мной сяброўка Маргарыта Іванаўна. — Але сапраўды, калі ты сыты, спакойна выбіраеш прадукты, а не накідваешся на ўсё, што апетытна выглядае і смачна пахне. Яшчэ парада — амаль у кожным гіпермаркеце ёсць тавар пад уласнай гандлёвай маркай. Упакоўка на ім, можа быць, не самая прыгожая, затое цана ніжэйшая.*

Тавар пад уласнай гандлёвай маркай выпускаюць усе больш-менш буйныя рознічныя сеткі. Не выдаткоўваючы сродкі на рэкламу, сеткі дамагаюцца больш нізкай цаны. Вядома, якасць у такіх тавараў можа быць рознай — усё залежыць ад патрабаванняў, якія прад'яўляліся да вытворцы. Але, як правіла, прадукты атрымліваюцца ндрэнныя. Так што эксперыментуйце з прыватнымі маркамі рознічных сетак — гэта дазволіць сэканоміць немалую частку сямейнага бюджэту.

### КАБ БЫЛО НЯЦЯЖКА

Вось некалькі простых парад. Для пачатку адсачыце асноўныя артыкулы выдаткаў і падумайце, якія з іх можна скараціць, а якія не. Ёсць рэчы, якія проста неабходныя нам для псіхалагічнага камфорту: для некаторых людзей — гэта абноўка раз на тыдзень, для іншых — шакаладка. Адмаўляцца ад такіх любімых рэчаў не варта. Грошай, вядома, можа і не дабавіцца, але пазбаўляць сябе маленькіх радасцяў нельга — ёсць небяспека «сарвацца» ў значна больш буйныя растраты. І яшчэ: скарачаць выдаткі трэба толькі па адным кірунку. Напрыклад, спачатку вы эканоміце на артыкуле «забавы», затым — на вопратцы. У такім выпадку звычка эканоміць у вас будзе выпрацоўвацца паступова, а адчуванне стрэсу можна будзе пазбегнуць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Блізкая ўлада

# ТЭЛЕФАНУЙЦЕ ЗАЎТРА!

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 13 ліпеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.**

Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# ХОЛАДНА НЕ ПА СЕЗОНЕ

## Тэмпературны фон будзе ўтрымлівацца на 3—5 градусаў ніжэй за кліматычную норму ліпеня

**У чэрвені мы знемагалі ад спёкі, прасілі сонейка быць менш гарачым. Але прыйшоў ліпень і ўсё змянілася. Дажджы, навальніцы, слабы туман і далёка не летняе надвор'е. І цяплей пакуль не будзе. У бліжэйшыя дні на тэрыторыю краіны працягне паступаць паветраная маса з поўначы Еўропы, так што разлічваць на цяпло не прыходзіцца. Праўда, у выхадныя дні дажджоў будзе менш, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Максімальная тэмпература паветра ад плюс 16 да плюс 22 градусаў. А вось у суботу ўначы будзе пераважна без ападкаў. Удзень у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень — плюс 16—23 градусы. У нядзелю месцамі не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў, удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, удзень — 15—22 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—13 цяпла, днём — ад плюс 16 да плюс 23 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Будзь у курсе!

# У Мюнхен з Мінска — прамым рэйсам

**15 ліпеня авіякампанія «Белавія» адкрые першы рэйс па маршруце Мінск — Мюнхен.**

Як паведамілі ў прэс-службе перавозчыка, палёты туды будуць выконвацца на рэгулярнай аснове чатыры разы на тыдзень з вылетам з Мінска па панядзелках, чацвяргах, пятніцах і нядзелях і прыбыццём у Міжнародны аэрапорт Мюнхен у 13.35.

Зваротны рэйс з Мюнхена плануецца выконваць з вылетам у 14.15 і прылётам у Нацыянальны аэрапорт Мінск у 17.15. Час для ўсіх аэрапортаў указаны мясцовы.

Палёты плануецца ажыццяўляць на камфартабельным авіялайнеры Embraer 175 умяшчальнасцю 76 месцаў. Час знаходжання ў паветры складзе каля дзвюх гадзін.

Кошт авіябілетаў пры набыцці на сайце авіяперавозчыка ў адзін бок складзе ад 115 еўра, уключаючы таксы і зборы, і ад 225 еўра — туды-назад. Білеты ўжо даступныя на сайце www.belavia.by.

На сённяшні дзень беларускі авіяперавозчык выконвае рэгулярныя рэйсы на наступных нямецкіх напрамках: Берлін, Франкфурт і Гановер.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Культасвета

# ГІСТОРЫЯ Ў ФАРБАХ

**У Мінску адкрылася рэспубліканская выстаўка, прысвечаная 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**



Соф'я Лі. Дзень Перамогі.

Днямі ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі прэзентавалі новы творчы праект, прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны. На экспазіцыі прадстаўлена больш за 150 твораў аўтараў, што належаць да розных пакаленняў: ад былых франтавікоў, якія пераносілі на палатно асабісты боль і ўспаміны пра ваеннае ліхалецце, да сучасных маладых майстроў, якія прадставілі сваё бачанне вайны праз вывучэнне гістарычнага матэрыялу і ўспаміны ветэранаў.

«Свята вызвалення нашай краіны не можа быць адзначана адным днём, тым больш, калі прыгадаць, ад якой навалы мы вызваліліся, — адзначыў на адкрыцці выстаўкі **старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА.** — Таму гэтай маштабнай рэспубліканскай выстаўкай мы робім свой, мастацкі ўнёсак у святкаванне, ушаноўваем бацькоў і дзядоў, якія здабывалі Перамогу, набліжалі вызваленне нашай Бацькаўшчыны. Сярод прадстаўленых карцін звыш 60 — з фондаў саюза мастакоў, гэта рарытэтныя палотны тых аўтараў, якія не толькі бачылі Вялікую Айчынную вайну на свае вочы, але змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах».

Так, з запаснікаў выйшлі да шырокай аўдыторыі палотны Леаніда Шчамялёва, Гаўрылы Вашчанкі, Барыса Аракчэева, Яўгена Зайцава, Пятра Масленнікава, Івана Стасевіча і многіх іншых майстроў, і гэта без перабольшання россып мастацкіх скарбаў. «Большасць з прадстаўленых работ я бачыла толькі што завершанымі, яны яшчэ пахлі свежымі фарбамі, а побач стаялі іх аўтары. Шкада, што тады не было розуму, каб занатоўваць усе іхнія ўспаміны пра падзеі, адлюстраваныя ў выявах гэтых твораў. А цяпер няма большасці з тых людзей, няма ў каго спытаць, — сумуе **мастацтвазнаўца Ларыса ФІНКЕЛЬШТЭЙН.** — Але засталося іхняе мастацтва, а ў ім — непрыдуманая гісторыя жыцця нашых бацькоў, нашай краіны».

Для віцебскага **мастака Уладзіміра ВАЛЬНОВА** Вялікая Айчынная вайна — глыбока асабістая тэма. У чэрвені 1944-га яго, хлопчыка прыкладна чатырохгадовага ўзросту, падабралі літаральна ў танкавай каляіне пад Гарадком савецкія салдаты. З прычыны маленства з сабой «на Берлін» не ўзялі, адправілі ў дзіцячы дом. Значна пазней, змяніўшы за паўтара дзясятка гадоў тры дзетдамы ў Расіі, Уладзімір даведаўся, што яго маці расстралялі як жонку партызана ў 1943-м, старэйшы брат Алік прапаў без вестак. Вырашыў знайсці хоць бы сваякоў па бацькоўскай лініі, і гэта ўдалося праз абласную газету: «свайго» прызналі цётка, дзед і бацька, хоць і бачыў апошні раз сына яшчэ зусім маленькім... І хоць цеплыню стасункаў з блізкімі Уладзімір Мікалаевіч адчуў наноў, але вайна, што адняла ў яго маці, так і сядзела занозай у сэрцы — балела, не адпускала. На гэту тэму ён зрабіў мноства жывапісных і графічных работ, калажаў, інсталяцый, якія бачыла публіка не толькі ў Беларусі, але і ў розных гарадах Германіі. Прадстаўленая на цяперашняй рэспубліканскай выстаўцы інсталяцыя «Прысвячаю памяці маці...» працягвае гэтую ж пранізлівую лінію — вайна як страшная трагедыя, што знішчае цэлыя сем'і і нясе боль... 75 хустак жанчын, якія перажылі выпрабаванні вайны і пасляваеннага часу, злучаныя суровымі чорнымі ніткамі (лёсу?) з пісьмамі — франтавымі трохкутнікамі, даведкамі, пахавальнымі... Гэта, дарэчы, адсканаваныя копіі сапраўдных дакументаў. Яшчэ больш узмацняе шчымлівае пачуццё сапраўднасці актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа Людміла Заграбельная, якая стварыла для інсталяцыі абагульнены вобраз усіх салдацкіх маці: яна перабірае і перачытвае пісьмы, нешта нашэптвае, а мо, чытае малітву... «Мяне шмат гадоў не адпускае тэма вайны, — прызнаецца Уладзімір Вальноў, — хацеў, нарэшце, выказаца напоўніцу і для сябе паставіць кропку ў ёй. Дарэчы, хутка будзе мая выстаўка ў Расіі — калі адведзенае памяшканне дазволіць, пакажу гэту інсталяцыю і там. Хоць, мне здаецца, нідзе так глыбока, як у нас у Беларусі, не зразумеюць, што я хацеў сказаць».

Прадстаўнікі цяперашняга пакалення, канешне, не ўсе ведаюць, пра якую трагедыю распавядае карціна Нінэль Шчаснай «Аблінга», з вокнаў якога будынка колішняя партызанская сувязная і разведчыца, беларуская і савецкая мастачка Сафія Лі глядзела на Плошчу Перамогі, альбо чыю памяць увекавечыў у сваёй рабоце брэсцкі мастак Эдуард Куфко, які зведаў і жахі нямецкага канцлагера, і лесапавалы ГУЛАГа... Аднак сучасныя мастакі, вывучаючы архівы і вопыт сваіх педагогаў, таксама рызыкнулі паказаць, якой бачыць вайну пакаленне, што пра яе толькі чытала ў кніжках ды бачыла ў фільмах. Вынікі гэтага пераасэнсавання таксама ўвайшлі ў экспазіцыю: калі для адных вайна — неад'емная частка сямейнай гісторыі, якая захоўваецца праз гады (Ігар Свянціцкі, «Фотаздымак дзеда»), то для другіх — містычная чорная навала (Іна Сакалова-Кубай, «Крумкачы»), гераічны подзвіг (Аляксандр Асядоўскі, «Знішчальнік»). А для кагосьці наогул гульня ў «вайнушку» на клятчастым аркушы са школьнага сшытка...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, фота аўтара.**

Ведай нашых!

# Нязгаснае святло душы

**...Маляваць можна алоўкам, вугалем, акварэллю, алеем, пяском...**
**Можна — словамі.**



Такім чынам, малюнак першы: раніца, рэдакцыя, работы, як кажуць, з галавой, а тут яшчэ — дзверы адчыняюцца і...

— Адгадайце, хто да вас прыйшоў! — з парога прапануе жанчына.

Мы — нават не спрабуем.

— ...З Пастаў, — з хітрынкай падказвае госця. — Захарэвіч...

— Тая самая?! — радасці не схаваць. — Ніна Маркаўна?! Паэтка-настаўніца? Гумарыстка!

...Праз гады — карціна другая. Паставы. Дзень пісьменства. Стэнд «Звязды». Там мы раскладваем рэкламную прадукцыю, ладзім конкурс на найлепшыя радкі пра газету і лапці, прымаем гасцей...

— Ну, адгадайце, хто да вас прыйшоў, — прапануе раптам адна з іх і тым самым, што называецца, выбівае глебу з-пад ног, бо амаль год таму Ніны Маркаўны не стала...

— А я, — нібы «счытаўшы» думкі, кажа нам госця, — яе дачка: Людміла Курыловіч.

Тады падчас размовы мы даведаліся, што яна — таксама настаўніца, намесніца дырэктара адной з маскоўскіх гімназій, кансультант Дэпартамента сацыяльнай палітыкі Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы. А яшчэ (гэта ўжо свежая інфармацыя)... мастачка.

Што цікава, вось гэтую, новую прафесію спадарыня Людміла займела зусім нядаўна і... за нейкія чатыры гады не проста напісала, — паспела выставіць дзясяткі сваіх карцін, адна з якіх — партрэт «Мудрасць» *(на здымку)* — перамагла ў конкурсе жывапісу на тыдні мастацтваў Грэцыі.

Убачыць гэту работу (як і шэраг іншых) могуць і землякі Людмілы Курыловіч: у Мінску, у галерэі «Універсітэт культуры», адкрылася яе персанальная выстаўка, мэта якой, па словах мастачкі, «паказаць, што і ў 50 можна пачаць новае жыццё, новую справу, якая будзе прыносіць задавальненне не толькі табе — іншым таксама».

Дарэчы, назву для выстаўкі — «Светлая памяць душы» — спадарыня Людміла запазычыла: менавіта так называўся зборнік вершаў яе маці. На жаль, апошні.

**Валянціна ДОЎНАР, фота аўтара.**

Беларусь памятае

# Трэба вярнуць яшчэ тысячы імёнаў...

У аўтаматызаваны банк даных «Кніга памяці Рэспублікі Беларусь» унесены ўліковыя запісы пра месцы пахавання больш чым 2,8 мільёна чалавек, якія загінулі падчас вайны. На жаль, звесткі ўстаноўлены толькі пра прыблізна 527 тысяч з іх. І, як заўважыў **начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь Сяргей ВАРАНОВІЧ,** працы пошукавікам хопіць яшчэ на доўгія гады.

Толькі за мінулы год на дзяржулік было прынята 44 воінскія пахаванні і 17 пахаванняў ахвяр войнаў. У выніку правядзення архіўна-даследчыцкай работы ваеннымі камісарыятамі, грамадскімі аб'яднаннямі, грамадзянамі ў 2018 годзе былі ўнесены звесткі пра 12 тысяч загінулых, а за гэты год удакладнена і ўнесена ў аўтаматызаваны банк даных інфармацыя ўжо больш чым пра шэсць тысяч чалавек.

У 2018 годзе на рэалізацыю дзяржпраграмы на 2015—2020 гады па ўвекавечанні загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці ахвяр войнаў выдаткавана больш за два мільёны рублёў. Мясцовымі ўладамі летась праведзены рамонт больш чым на чатырох тысячах магіл вайскоўцаў і ахвяр войнаў. На мемарыяльныя пліты нанесены звесткі больш чым пра дзевяць тысяч чалавек.

52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён летась праводзіў раскопкі на 67 аб'ектах на тэрыторыі 34 раёнаў усіх абласцей, на пяцідзесяці з іх былі знойдзены парэшткі загінулых. Для далейшага перазахавання мясцовым выканаўчым і распарадчым органам былі перададзены 1913 ахвяр войнаў, з іх 1787 загінулі ў гады Вялікай Айчыннай, 106 — падчас Першай сусветнай, 10 — у ходзе вайны 1812 года. Па выніках палявых пошукавых работ устаноўлены імёны 55 загінулых. Прычым «салдатам памяці» ўдаецца аднаўляць імёны воінаў не толькі апошняй вайны. Так, падчас раскопак у Пастаўскім раёне былі падняты астанкі дзясятка салдат імператарскай арміі часоў Першай сусветнай. Пошукавікі знайшлі тут дзве гільзы з запіскамі, якія, нягледзячы на тое што яны больш за сто гадоў праляжалі ў зямлі, можна прачытаць. Адно з імён ужо вядома, над другім працуюць у архівах.

Сярод буйных знаходак мінулага года — няўлічанае пахаванне на ўскрайку Нясвіжа ў пясчаным кар'еры. Пошукавыя работы сцвердзілі, што там ляжаць — былі знойдзены астанкі 1035 мірных грамадзян і 32 ваеннапалонных Чырвонай арміі, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Падчас пошукавых работ каля вёскі Давыдавічы Калінкавіцкага раёна быў знойдзены ордэн Аляксандра Неўскага, па нумары было ўстаноўлена імя яго ўладальніка — старшага лейтэнанта, камандзіра мінамётнай роты. Узнагарода была перададзена пляменніку — Герою Савецкага Саюза, лётчыку-касманаўту Аляксандру Віктаранку.

За пяць месяцаў бягучага года прынята на ўлік 20 пахаванняў салдат і шэсць — ахвяр войнаў. Усяго ж на 1 чэрвеня на ўлік пастаўлена 7732 пахаванні. Як заўважыў Сяргей Варановіч, калі ў мінулым пры вызначэнні месцаў для раскопак арыентаваліся на звесткі відавочцаў, то сёння палявым работам папярэднічае архіўна-даследчыцкая праца. Свабодны доступ у інтэрнэт, рассакрэчаныя архіўныя дакументы дапамагаюць знаходзіць каштоўную інфармацыю. Працуюць пошукавікі і з картай 1946 года, на якой пазначаліся няўлічаныя воінскія пахаванні. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пастановай Савета народных камісараў было прынята рашэнне аб узбуйненні пахаванняў, пераносе астанкаў з розных месцаў у адзіныя брацкія магілы і стварэнні мемарыяльных комплексаў. Але ў тыя часы з прычыны недахопу людскіх рэсурсаў, складанага эканамічнага становішча такія работы не ўсюды былі праведзены і на месцах такіх пахаванняў яшчэ трэба праводзіць пошукавую працу.

На гэты год запланаваны работы на 96 аб'ектах, на дадзены момант ужо адпрацаваны 34. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам для перазахавання перададзены астанкі 1500 загінулых, устаноўлены звесткі пра 13 чалавек, якія не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**




## ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА...

На курсы перападрыхтоўкі настаўнікі ездзілі раней кожныя пяць гадоў (а калі хочаш павысіць катэгорыю, то і часцей).

Некаторыя, праўда, аднекваліся: то дзяцей няма з кім пакінуць, то гаспадарку, то яшчэ якія прычыны. А я дык любіла ездзіць, бо хоць на які час ды адрынеш усе дамашнія клопаты, вырвешся з вёскі ў горад, перад тым — гардэроб свой падновіш, стрыжку-завівачку зробіш... Ну, як жа інакш, калі наперадзе — новыя сустрэчы, уражанні, адчуванні: апынешся ў ролі студэнта, міжволі памаладзееш.

А калі да ўсяго да гэтага пры інстытуце ёсць свой прафілакторый, дык у настаўнікаў і ўвогуле панскае жыццё: жытлом забяспечаны, есці гатаваць не трэба, здароўе папраўдзіць можна...

Аднак — шчыра кажу — гэта ўсё па-другое. Па-першае — на тых курсах мы многаму вучыліся — і на лекцыях, і як бы між іншым. Ну вось, напрыклад. Адна з выкладчыц, інспектар аблана (усе — з-за медных валасоў — звалі яе «чырвонай галавой»), неяк зрабіла «лірычнае адступленне, расказала...

Гісторыя — далібог для нашага «Провада...»! А таму далей — з яе слоў:

«Ніхто не любіць праверак, а ўжо вясковыя настаўнікі дык, мусіць, найбольш. Чакаюць «рэвізораў» з райана — хвалююцца, а калі з аблана — дык «трасецца» ці не ўвесь раён.

Ну вось, напрыклад: прыехалі мы неяк у адну вясковую школу. Трохі агледзеліся там, а празвінеў званок, і ўсе настаўнікі ды нашы інспектары разышліся па класах. Я — засталася ў настаўніцкай. Сяджу там, працую з дакументамі, як раптам — тэлефонны званок. Ды такі ж настойлівы... Падымаю слухаўку. Адтуль — ні табе вітання, ні дзяжурных пытанняў (ці туды, маўляў, трапіла, з кім размаўляю) — толькі ўсхваляванае:

— Да вас праверка прыехала?

Кажу:

— Так.

— І гэта, з чырвонай галавой, таксама?

— Таксама.

— Во ліха! Значыць, і да нас прыпрэцца... Што хоць правяраюць?

— Ды ўсё, — кажу, — сшыткі, дзённікі, журналы, веды і навыкі вучняў, планы — каляндарныя і паўрочныя, канспекты самаадукацыі, работу з бацькамі...

— Тады нам капец... Знойдзь да чаго прычапіцца!

Я толькі хацела сказаць, што не трэба так думаць, — чую, няма каму: кароткія гудкі, канец размове.

Ну, думаю, і няхай: можа ж, працяг будзе.

І сапраўды: прыязджаем назаўтра ў суседнюю школу, размаўляем з настаўнікамі, і я па голасе лёгка пазнаю ўчарашнюю суразмоўніцу, «прашуся» да яе на ўрок.

Тая, бачу, аж спалатнела...

Але ж да заняткаў — па ўсім відаць — рыхтавалася — і сама, і вучні яе. Урок прайшоў досыць добра — няма да чаго «прычапіцца», ды і мэты такой я ніколі не ставіла.

А таму, пасля заканчэння праверкі, на педсавеце, пры ўсіх, працу гэтай маладзенькай настаўніцы ацаніла досыць высока (тая не самлела ад радасці!)... Праўда, у канцы і як бы між іншым я дадала:

— Просьба да вас хіба адна: раскажыце вучням, як трэба размаўляць па тэлефоне.

Твар дзяўчыны заліла чырвань, якой ніхто, здаецца, не згледзеў і нічога не зразумеў».

...Гэту, пачутую на курсах гісторыю, я потым расказала сваім дзецям, калегам, вучням. Для многіх яна стала добрым урокам, як і для той маладзенькай настаўніцы.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## КОЛЬКІ Б ВОЎК НІ ВАЛОК, ПАВАЛАКУЦЬ І ВОЎКА

Кажуць, хто валодае інфармацыяй — валодае светам. Але ж гэта недзе там, а ў вёсцы шчаслівы той, хто мае каня.

Дык вось. Былі часы, калі Кастусёк (па мянушцы Верабей) прасіў, каб далі яго то гарод узараць, то бульбу пасадзіць ці нешта прывезці... А тут раптам пашчасціла: ён сам і досыць удала набыў каняку, вяскоўцы пайшлі да яго! Ды ўсе з просьбамі, усе з паклонамі: выручай, маўляў, без канька ніяк!

Кастусь гэта помніў і разумеў, але ж хіба спачатку, бо потым ён заганарыўся і стаў непрыступным, як тая скала, — нават размаўляць з людзьмі не хацеў. Крычаў:

— Усё вам каня ды каня... Давай ды давай... А ён мне самому, можа, патрэбен! Па сена апоўдні ехаць...

І каб тое сена было, а то ж (вёска ведае) — не... І ехаць ён нікуды не збіраецца, проста цану сабе набівае: то браў за каняку пляшку гарэлкі ды 50 рублёў, то меней літра ўжо і не паказвай. Ды закусь яшчэ падрыхтуй...

Карацей, з падворка Вераб'я людзі часта сталі сыходзіць з крыўдай і без каня. Той — уеўшыся — днямі пасвіўся на выгане. Гаспадар яго хіба выгульваў — час ад часу ездзіў у мястэчка па хлеб ці што іншае. Усядзецца тады, пугай над крупам засвішча ды як закрычыць: «Но-о, залётная!»

І з форсам... Па вуліцы... Толькі пыл стаіць.

...Аднак вяскоўцы Вераб'ю не зайздросцілі, яны толькі ўсміхаліся: маўляў, палётай сабе, некалі ж спынішся.

Аднойчы і сапраўды... Ён, што называецца, пад добрай мухай вяртаўся з кірмашу і разам з канём трапіў пад машыну. У бальніцы апрытомнеў.

— Ну што, — пытаецца доктар, — жывы? Конь у кювеце, сам у лазарэце? Тпру-у, прыехалі?

Хворыя смяюцца, а небарака губу закусіў, як конь свае цуглі, ды маўчыць. І дзень, і другі, і трэці думу горкую думае, што зараз яму самому зноў прыйдзецца хадзіць да людзей, прасіць, каб далі каня, купляць паўлітэрку, а то, можа, і літр... З закускай...

Вераб'ю вельмі страшна было, што нехта абыдзецца з ім акурат таксама, як некалі ён.

**Зігмунд Дзякевіч,**
*в. Пянценішкі, Воранаўскі раён.*

## НЕ КІЕМ, ДЫК ПАЛКАЮ...

Мне пераваліла за 80, і гэта, вядома ж, ёмісты ўзрост. За плячыма шмат і перажытага, і незабытага.

Жыла я ў досыць беднай сялянскай сям'і, якая складалася, як людзі казалі, са старога, малога і хворага. Гэта значыць, бабулі, мяне і мамы-інваліда. Тата ад маіх трох гадоў сышоў да іншай жанчыны.

З часам змянілася і наша сям'я. Калі я была ў сёмым класе, памерла бабуля, і мы з нямоглаю мамай засталіся ўдзвюх. Яна, праўда, шмат што ўмела — добра вязала, вышывала, рабіла выцінанкі і кветкі з паперы, таму грошай трохі зарабляла. Усё астатняе было на мне.

Але школу я скончыла. Трэба вучыцца далей, але маму пакінуць няма як... Прыйшлося паступіць на завочнае і пайсці працаваць важатай. А паралельна...

Як зараз помню, у 1954-м пачалася падпіска на апошнюю дзяржаўную пазыку. Сельскі Савет, каб правесці яе, стварыў рабочыя групы, замацаваў за імі пэўныя вёскі-хутары, склаў спісы, хто на якую суму павінен добраахвотна (?) падпісацца... А далей пайшла непасрэдная работа з людзьмі, паходы па хатах.

Наша група (я ў ёй — збоку прыпёку) складалася з мясцовага дэпутата, рабочага-камуніста з цукровага завода і дзвюх настаўніц. Самы першы — дэпутат — звычайна маўчаў (але добра ведаў, хто можа даць колькі грошай), другі, той рабочы-камуніст, ды настаўніцы, заходзячы ў хаты, найбольш гаварылі. Пра што? Пра цяжкае становішча ў краіне, пра вялікую патрэбу ў грашах, у вось гэтай пазыцы. Кожнаму гаспадару ці гаспадыні называлася сума... (Праўда, некалькі большая, чым пазначана ў спісе.) Але ж, здаралася, людзі давалі і яе. Нам гэта залічвалася, як «звыш плана». А вось на меншую суму група не згаджалася. Нельга было.

- документ, подтверждающий внесение в срок по 6 августа 2019 г. до 16.00 включительно указанной суммы задатка на расчетный счет ГУ МФ РБ по Брестской области р/с № BY53 AKBB 3600 2260 0241 9000 0000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, УНП 200 676 206, код платежа 04002, код банка AKBBBY2X;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов;
- физическими лицами – копия документа, содержащего идентификационные сведения, а их представителями – нотариально удостоверенная доверенность;
- индивидуальным предпринимателем — копия свидетельства о государственной регистрации, а их представителем – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. Фамилия доверенного лица сообщается заранее.

Заявления и прилагаемые к ним документы принимаются с 8.00 15 июля 2019 г. по 6 августа 2019 г. до 16.00 по адресу: г. Столин, ул. Советская, 69, 1-й этаж, 20-й кабинет.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Условия, предусмотренные для победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона):

в установленный законодательством срок осуществить государственную регистрацию прав на земельный участок;

не позднее одного года со дня государственной регистрации прав получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство;

не позднее шести месяцев (для юридических лиц, индивидуальных предпринимателей) и одного года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации и получения разрешения на строительство приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью его предоставления;

до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и использовать его для улучшения земельного участка;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

по окончанию срока аренды земельного участка возвратить его прежнему землепользователю в состоянии, пригодном для использования по целевому назначению, либо не позднее трех месяцев до окончания срока аренды обратиться в Столинский районный исполнительный комитет за его продлением.

Для ознакомления с материалами землеустроительного дела по формированию земельного участка для проведения аукциона, градостроительной и иной документацией, а также по вопросу организации осмотра на местности земельного участка можно обращаться в отдел землеустройства Столинского райисполкома.

Адрес и контактные телефоны комиссии: г. Столин, ул. Советская, 69, 1-й этаж, каб. 20, (8-01655) 2 28 63, 2 02 96.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Не пачынайце актыўных дзеянняў, не вызначыўшыся з мэтамі, інакш час і сілы будуць выдаткаваныя марна. Калі ваша інтуіцыя пярэчыць прыняццю, здавалася б, відавочнага рашэння, тут нешта не так, і да яе варта прыслухацца. На гэтым тыдні надзвычай вялікія шанцы вырвацца з руціны і адправіцца ў адпачынак.



**ЦЯЛЕЦ.** Будуць удалымі паездкі і кантакты. У першай палове тыдня варта разлічваць толькі на сябе і ўласнае ўменне дамаўляцца з апанентамі. Калі родныя захочуць дапамагчы, мякка адмоўцеся, бо карысці ад гэтага будзе мала, а часу яны зоймуць шмат. Чацвер можа аказацца складаным днём, калі ад прыкрых выпадковасцяў бурацца планы. Зрэшты, падзеі, што адбываюцца, варта разглядаць як знакі лёсу.



**БЛІЗНЯТЫ.** Надыходзіць спрыяльны момант для актыўнай дзейнасці. Менавіта цяпер вашы мары маюць шанц рэалізавацца. Неабходна сабрацца з сіламі і не дазваляць сабе расслабляцца і ўпадаць у роспач. У самых актыўных і рашучых прадстаўнікоў знака можа з'явіцца шанц стварыць сям'ю або адкрыць уласную справу. Выхадныя лепш правесці на прыродзе.



**РАК.** На гэтым тыдні старайцеся больш часу праводзіць на прыродзе, абмяжуйце зносіны з гарадскімі з'явамі да неабходнага мінімуму. Пажадана ўлічваць інтарэсы калег і праяўляць ініцыятыву, ідучы на кампраміс. Прыслухайцеся да парад сяброў і сваякоў, бо некаторыя моманты можаце самі не заўважаць, а ім збоку бачныя вашы прамашкі.



**ЛЕЎ.** З'явіцца больш магчымасцяў, але павялічыцца і колькасць абавязкаў, асабліва гэта датычыцца работы. У панядзелак не варта ўступаць у дыскусію з начальствам — акрамя непрыемнасцяў размова нічога не прынясе. У сераду праявіце рашучасць і актыўнасць літаральна ва ўсім, і тады спадарыня Фартуна будзе да вас вельмі добразычлівая. У пятніцу лепш адпачыць і не пачынаць нічога важнага, бо планы могуць спраўдзіцца з дакладнасцю да наадварот.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні цалкам верагодна выкананне запаветных жаданняў, абы яны мелі больш-менш рэальныя абрысы. Вынікі вашай дзейнасці абяцаюць быць заўважнымі і важкімі. Не замыкайцеся ў сабе, не грэбуйце магчымасцю завесці новыя знаёмствы — яны абяцаюць адкрыць перад вамі іншыя далягляды. Будзеце поўныя сіл і энергіі — і зможаце паспець зрабіць многае.



**ШАЛІ.** Вы — творца свайго шчасця, не ўпусціце гэты залаты час. Не распыляйцеся, пастаўце сабе пэўную мэту і імкніцеся да яе дасягнення. У аўторак верагодная сустрэча з сябрам, якому спатрэбіцца ваша дапамога і падтрымка. Да выхадных вамі можа авалодаць ахвота да змены месцаў, таму будзе карысна трохі павандраваць.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні вырашальную ролю будуць іграць вашы сувязі і знаёмствы. Вас чакаюць дзелавыя зносіны, дзе крытэрыямі паспяховасці будуць практычнасць, законнасць, а таксама дакладнасць інфармацыі. Старайцеся быць у курсе падзей, якія адбываюцца. Ад таго, наколькі вы будзеце дасведчаныя, залежыць многае. У вас лёгка будуць атрымлівацца любыя справы. Але і пра асабістае жыццё не забывайцеся.



**СТРАЛЕЦ.** Пажадана прыцішыць запал і больш уважліва паставіцца да дзелавых праектаў. Залішняя спешка пагражае прывесці да сур'ёзных фінансавых страт. У другой палове тыдня магчыма схаванае процідзеянне вашым планам. Акуратна вядзіце свае справы, часцей райцеся са спецыялістамі, бо ёсць вялікая рызыка памылак. У аўторак можаце знайсці новую работу ці новых сяброў. У пятніцу нечаканы паварот падзей паўплывае на ваш далейшы лёс — не бойцеся перамен. Старайцеся быць рэалістам і не патрабуйце ад блізкіх людзей занадта шмат.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні жаданне раз і назаўжды зусім рассекчы гордзіеў вузел лепш стрымаць. Цяпер не час ваяваць, лепш прыстасоўвацца да складаных абставін. Кароткія паездкі ў аўторак будуць удалыя і пазнаёмяць з цікавымі людзьмі. Магчымыя цікавыя прапановы новай работы. У другой палове тыдня вакол вас могуць бушаваць жарсці — не дайце ім зайсці занадта далёка. Выхадныя лепш правесці за горадам, але не тырчыце ўвесь час на градках, зрабіце пікнік з сябрамі.



**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні самы час высветліць сутнасць праблем, якія назбіраліся, і пачаць іх вырашаць. У сераду варта падумаць пра перспектывы кар'ернага росту. У вас ёсць рэальны шанц стаць сапраўдным гаспадаром становішча. Творчы настрой у чацвер дазволіць здзейсніць свежыя ідэі сяброў і калег па рабоце. У сярэдзіне тыдня адносіны з блізкімі людзьмі могуць аказацца не такімі ўжо бясхмарнымі, але да выхадных хмары рассеюцца, і вы выдатна праведзяце час у сямейным коле.



**РЫБЫ.** Няздрэнна было б навесці парадак і ў паперах, і ў галаве, і ў асабістых адносінах. Пажадана захоўваць эмацыянальную раўнавагу і не раздражняцца па дробязях. У аўторак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі, магчыма далёкае падарожжа, якое дазволіць атрымаць поспех у справах. У чацвер верагодныя прыемныя падзеі ў сямейным жыцці. У суботу лепш выбрацца за горад або наведаць цікавую выстаўку, канцэрт.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.53 | 21.37 | 16.44 |
| Віцебск — | 4.34 | 21.34 | 17.00 |
| Магілёў — | 4.43 | 21.27 | 16.44 |
| Гомель — | 4.48 | 21.15 | 16.27 |
| Гродна — | 5.09 | 21.51 | 16.42 |
| Брэст — | 5.19 | 21.43 | 16.24 |

### Месяц

*Першая квадра 9 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр.* *Пятра, Паўла, Рыгора.*
*К.* *Веранікі, Веры, Яніны, Андрэя, Брунона, Васіля, Яна.*



Фота Софʼі КУСЯНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**12 ЛІПЕНЯ**




**1904** год — нарадзілася Аляксандра Іванаўна Александровіч, беларускі педагог і літаратуразнаўца. Вядомая як першая выканаўца ролі Алесі ў музычнай драме М.Чарота «На Купалле» ў БДТ-1. Аўтар артыкулаў пра творчасць Я. Купалы, З. Бядулі, Ф. Багушэвіча, М. Танка і іншых. Складальнік падручнікаў і хрэстаматый для сярэдніх школ. Пераклала на беларускую мову кнігі для дзяцей. Памерла ў 1947 годзе.

**1909** год — нарадзіўся Павел Іванавіч Іваноў, беларускі акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі (1940). З 1929-га — на сцэне Беларускага тэатра імя Я. Коласа, з 1945-га — у Беларускім тэатры імя Я. Купалы, у 1964—1969 гадах — рэжысёр Мінскага народнага тэатра Палаца культуры і тэхнікі МАЗ. Выканаў шэраг характарных і камедыйных роляў у пастаноўках айчынных і замежных драматургаў. Памёр у 1989 годзе.

**1914** год — нарадзіўся (вёска Крывель Шклоўскага раёна) Пётр Мартынавіч Алейнікаў, (савецкі кінаакцёр. З улацівымі яму абаяннем, прастатой і натуральнасцю ігры ўвасобіў на экране тып маладога сучасніка — вясёлага, жыццярадаснага хлопца. Здымаўся ў фільмах «Сямёра смелых», «Трактарысты», «Вялікае жыццё», «Неба Масквы» і іншых. Памёр у 1965 годзе.



**1929** год — нарадзіўся Пётр Іосіфавіч Лабко, беларускі вучоны ў галіне анатоміі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1951 годзе скончыў Мінскі медыцынскі інстытут, працаваў у ім. Аўтар навуковых прац па вегетатыўнай нервовай сістэме, уплыве неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя на стан нервовай сістэмы і ўнутраных органаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2011 годзе.




**100** год да н. э. — нарадзіўся Гай Юлій Цэзар, рымскі імператар. Ён паходзіў з патрыцыянскага роду Юліяў, старажытнага, але беднага. Атрымаў выдатную адукацыю, якая ў тыя часы заключалася ў вывучэнні грэчаскай мовы, літаратуры, філасофіі, гісторыі і красамоўства. Цэзар вылучаўся зайздроснымі здольнасцямі, а таму хутка дасягнуў выдатных поспехаў у вышэйпералічаных прадметах. Сам Цыцэрон быў настолькі высокай думкі аб прамоўніцкім мастацтве Цэзара, што ў адным з лістоў пісаў: «Хто вастрэйшы за яго, хто багацейшы думкамі! Хто пышнейшы і значна лепшы ў выразах!»

**1884** год — нарадзіўся Амадэа Мадыльяні, адзін з самых вядомых мастакоў канца XIX — пачатку XX стагоддзя, яркі прадстаўнік экспрэсіянізму. Памёр у 1920 годзе.

**1894** год — нарадзіўся Юрый Аляксандравіч Завадскі, расійскі акцёр і рэжысёр, педагог, народны артыст СССР. Лаўрэат Ленінскай і двойчы Сталінскіх прэмій. Герой Сацыялістычнай Працы. Памёр у 1977 годзе.

**1904** год — нарадзіўся Пабла Неруда, чылійскі паэт, грамадскі дзеяч. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры «за паэзію, якая са звышнатуральнай сілай увасобіла ў сабе лёс цэлага кантынента». Аўтар паэтычных зборнікаў «Іспанія ў сэрцы», «Оды першапачатковым рэчам» і іншых. Памёр у 1973 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

— Гэта служба падтрымкі?
— Так.
— Я хачу выпіць.
— Падтрымліваю!

**Небывалае здарэнне адбылося ў вёсцы Ніжнія Скіўцы. П'яная бойка тут перарасла ў вяселле.**

Двое сяброў.
— Якая яна, жанчына тваёй мары?
— Гадоў за сорак, злёгку паўнаватая, у акулярах і строгім касцюме, не вельмі прыгожая, але дагледжаная.
— Штосьці дзіўна, усе мараць пра маладых, стройных, прыгожых...

— Я працягну? Працуе натарыусам. І вось аднойчы яна мне тэлефануе і кажа: «Памёр мільярдэр, і вы яго адзіны спадчыннік».

**Людзі дзеляцца на жаўрукоў і соў, пакуль у іх не народзяцца дзеці.**

— Саня, ён сказаў, што нам трэба на поўнач. Дзе на гэтай карце поўнач?
— Лёша, мы ў метро... Поўнач засталася наверсе!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2339.
Нумар падпісаны ў 19.30 11 ліпеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

12 ліпеня 2019 г. № 28 (513)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Што? Дзе? Калі?




Праграма мерапрыемстваў VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. стар. 4

### Краны-волаты



У Слуцку пачалі выпускаць унікальнае абсталяванне. стар. 2

### Па дарозе да агульнай мэты



Развіццё транзітнага патэнцыялу і мадэрнізацыю транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы абмеркавалі за круглым сталом. стар. 4, 13

### Ключавы ігрок



Ці гатовы Ніжні Ноўгарад прыняць наступны Форум рэгіёнаў? стар. 14

### Заслужаная ўзнагарода



Віцебскі абласны Савет дэпутатаў і аблвыканкам атрымалі Пахвальны водгук у намінацыі «Найлепшы нарматворчы орган». стар. 16


ТЭМА ТЫДНЯ





# ЭФЕКТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА





Фота БелТА і Івана ЖДАНОВІЧА.

## Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі дазваляе вырашаць праблемы двухбаковага парадку дня

**У аўторак у Савеце Рэспублікі адбылося заключнае пасяджэнне беларускай часткі арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе 17–18 ліпеня ў Санкт-Пецярбургу.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 3

ГЛЯДЗІ І ПАЎТАРАЙ

# ПРАЦАВАЦЬ НА СЯБЕ

## Дэпутаты Магілёўскага аблсавета вывучылі на прыкладзе Горак, як рэалізуецца Дэкрэт № 7

**Вялікая прыбраная тэрыторыя, акуратныя вытворчыя памяшканні, людзі ва ўніформе... не, не кураць у цяньку, а дзелавіта ажыццяўляюць вытворчы працэс. На прадпрыемстве «Праметэй» ён няспынны. Тут робяць будматэрыялы, якія сёння вельмі запатрабаваныя як у народнай гаспадарцы краіны, так і ў звычайных спажыўцоў. Прыватнае прадпрыемства — адзін з найбуйнейшых забудоўшчыкаў у Беларусі. За апошнія пяць гадоў ім уведзена ў эксплуатацыю больш за 34 тысячы квадратных метраў жылля.**

### Прыклады для пераймання

З экскурсіі менавіта на гэта прадпрыемства пачалося выязное пасяджэнне дэпутатаў Магілёўскага аблсавета, у якім прынялі ўдзел і прадстаўнікі парламента, абл- і райвыканкамаў. **Генеральны дырэктар ПУВП «Праметэй» Анатоль ФЕДАРОВІЧ** — наглядны ўзор таго, як чалавек можа рэалізавацца на радзіме. Дарэчы, нават назва прадпрыемства, якім ён кіруе, сімвалічная. Менавіта так называўся той студатрад, камандзірам якога ён быў у гады сваёй маладосці. Чалавек, лічы, сам сябе зрабіў. Сёння яго прадпрыемства здольнае выконваць усе віды будаўніча-мантажных работ — ад праектавання (ёсць сваё праектнае бюро «Дэльта») да ўзвядзення жылых і іншых аб'ектаў «пад ключ». Бізнес стаў сямейным, яшчэ адным прыватным прадпрыемствам, якое вырасла з «Праметэя», — ТАА «Стас Інтэрнэшнл» — кіруе яго сын. Яно спецыялізуецца на выпуску мінеральнай, а таксама салодкай вады на аснове мінеральнай. А вада ў Горках, дарэчы, смачная, у ёй шмат вельмі неабходных чалавечаму арганізму мінералаў. Сакрэт свайго поспеху Анатоль Федаровіч бачыць у тым, што пад яго кіраўніцтвам працуе зладжаная каманда — дарэчы, болей чым з 600 чалавек.

— Хто хоча працаваць, ён будзе працаваць, а хто шукае прычыны нічога не рабіць, заўсёды іх знойдзе, — разважае ён. — Мы працуем 21 год, і ў нас гэта атрымліваецца. Сёння стала менш праверак, гэта плюс — дзяржава больш давярае. Раней было па 17 праверак за год, а сёння 1—2. Па шостым Дэкрэце закупілі шмат тэхнікі сусветна вядомых вытворцаў. Пасля выканання ўмоў інвестыцыйнага дагавора не плацілі ні падатак на дабаўленую вартасць, ні за «растаможку» — гэта вялікая справа: хутчэй акупілася.

Яшчэ адно сучаснае прадпрыемства ТАА «Рэмкам» спецыялізуецца на вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі і запчастак. Каля 87 % яго прадукцыі ідзе на экспарт у Расію, Малдову, Прыбалтыку, Арменію, Таджыкістан і Казахстан. Тут працуюць 75 чалавек, у іх ліку два кандыдаты тэхнічных навук і пяць аспірантаў.

Дарэчы, на абодвух прадпрыемствах наймальнікі звярталі ўвагу на тыя ўмовы працы, якія ствараюцца для работнікаў. Гэта магчымасць пабудаваць жыллё, годна адпачыць, забяспечанасць індывідуальнымі сродкамі абароны. Існуе заахвочвальная сістэма даплат за стаж і прадукцыйнасць працы. Наймальнікі лічаць, што ў работнікаў павінна быць жаданне працаваць з настроем. Тады ёсць вынік.

стар. 15

# Для бяспекі харчавання

**Навукова-даследчая лабараторыя функцыянальнага харчавання адкрылася на мінулым тыдні на базе навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні. У цырымоніі адкрыцця прыняў удзел старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі **першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ.** Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, у новай лабараторыі будуць займацца распрацоўкай персаніфікаванага харчавання для стварэння рэцэптур і інавацыйных тэхналогій функцыянальных харчовых прадуктаў. Тут таксама будуць праводзіць навуковыя даследаванні прадуктаў дзіцячага харчавання, харчавання для хворых са спадчыннымі і аліментарна-залежнымі захворваннямі, клінічныя даследаванні па ацэнцы эфектыўнасці новых відаў узбагачальных дабавак і іншага.

Гэты кірунак навуковай дзейнасці мае важнае значэнне не толькі для здароўя насельніцтва, але і для ўмацавання харчовай бяспекі, экспартнага патэнцыялу краіны, адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Ён прапанаваў прааналізаваць пытанне аб даасначэнні навукова-даследчых лабараторый, якія задзейнічаны ў дадзеным сегменце, неабходным сучасным абсталяваннем. Будзе вывучана пытанне аб стварэнні адпаведнай міжведамаснай працоўнай групы. З ініцыятывы Аляксандра Турчына абмеркавана магчымасць прыцягнення ў праекты па стварэнні новых прадуктаў харчавання венчурных інвестыцый.

«Здаровы лад жыцця, правільнае харчаванне — гэтыя рэчы цяпер выходзяць на першы план. Падбор для кожнага чалавека сваёй рэцэптуры харчавання — гэта, мне здаецца, вельмі перспектыўны кірунак. Такія тэхналогіі ў вытворчасці прадуктаў — наша сучаснасць і будучыня. Гэта яшчэ і перспектыўны рынак, думаю, што гэта адзін з кірункаў, па якіх Беларусі трэба рухацца наперад», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

# Кірунак супрацоўніцтва

**Мар'яна ШЧОТКІНА правяла пасяджэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана.**



Форум рэгіёнаў на тэму «Супрацоўніцтва рэгіёнаў як ключавы фактар міждзяржаўных адносін» — мерапрыемства афіцыйнага візіту ў Беларусь Прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева.

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, у аснову Форуму пакладзена ідэя садзейнічання рэалізацыі мерапрыемстваў дарожнай карты супрацоўніцтва, якую краіны падпісалі ў лістападзе 2018 года.

Мяркуецца, што падчас секцыйных і пленарнага пасяджэнняў Форуму ўдзельнікі абмяркуюць пытанні прамысловай кааперацыі, сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці, гуманітарнага, навуковага супрацоўніцтва і інавацый, міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Плануецца таксама падпісанне пагадненняў паміж рэгіёнамі, установамі адукацыі двух краін. Прапрацоўваецца заключэнне беларускімі прадпрыемствамі (БЕЛАЗ, МАЗ, «СветлагорскХімвалакно») камерцыйных кантрактаў з узбекскім бокам.

Мар'яна Шчоткіна выказала ўпэўненасць, што Форум рэгіёнаў створыць добры падмурак для далейшага супрацоўніцтва двух краін. «Цяпер Урад і Нацыянальны сход працуюць па ўсіх кірунках для паспяховага правядзення Форуму», — падкрэсліла намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

У пасяджэнні аргкамітэта прынялі ўдзел старшыні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, прадстаўнікі МЗС, Мінпраму, Мінадукацыі, Мінкультуры, БелГПП і іншых міністэрстваў і дзяржаўных органаў, а таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Насірджан Юсупаў.

# ВЫЗНАЧАЛЬНАЯ ЯКАСЦЬ

## Падпісаны кантракт БКК і BADC на пастаўку 450 тысяч тон хлорыстага калію

**Беларусь гатовая нарошчваць тэмпы паставак угнаенняў у Бангладэш — пра гэта паведаміў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Бангладэш Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас сустрэчы з адказным сакратаром міністэрства сельскай гаспадаркі гэтай краіны Эм-Дзі Насіруззаманам.**



«Мы задаволены станам нашых адносін, спадзяёмся на захаванне пераемнасці, стварэнне новых праектаў і рэалізацыю новых ідэй», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Ён падкрэсліў, што супрацоўніцтва абедзвюх краін заснавана на добрым партнёрстве дзяржаўных кампаній, якія кіруюцца прынцыпамі сумленнасці, адказнасці і павагі. Спікер верхняй палаты беларускага парламента нагадаў таксама, што Беларусь заўсёды падтрымлівала паўднёвазіяцкую краіну як у двухбаковых зносінах, так і на міжнародным узроўні, шчыра радуецца яе поспехам у развіцці эканомікі і іншых галінах.

«Мы гатовыя не толькі развіваць гандлёвыя адносіны, але і дзяліцца тэхналогіямі, каб ствараць сумесныя прадпрыемствы ў Бангладэш», — адзначыў спікер верхняй палаты беларускага парламента. Ён паведаміў журналістам, што гаворка на сустрэчы таксама ішла аб пастаўках тэхнікі, супрацоўніцтве ў галінах насеннявodства, падрыхтоўкі кадраў і адукацыі.

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на высокую якасць і канкурэнтаздольнасць тэкстыльных і скураных вырабаў, а таксама тавараў для лёгкай прамысловасці, вырабленых у Бангладэш. Па словах парламентарыя, яны карыстаюцца ў Беларусі попытам.

Эм-Дзі Насіруззаман, у сваю чаргу, нагадаў, што апошнія некалькі гадоў яго краіна імпартуе беларускія калійныя ўгнаенні, вельмі важныя для бульбы і іншай агародніны.

«Бангладэшская сельская гаспадарка выкарыстоўвае каля 900 тысяч тон калію штогод. Дзяржава закупляе палову гэтага аб'ёму, бо не мае адмысловага сховішча. У хуткім часе плануецца будаўніцтва склада для калійных угнаенняў, што здыме абмежаванні», — растлумачыў адказны сакратар мінсельгасу Бангладэш.

Кантракт на новы фінансавы год на пастаўку 450 тысяч тон хлорыстага калію ў Савеце Рэспублікі падпісалі генеральны дырэктар ААТ «Беларуская калійная кампанія» Алена Кудравец і старшыня BADC — дзяржаўнай карпарацыі па развіцці сельскай гаспадаркі Бангладэш Вахід Хондакер. Па выніках мінулага года доля БКК на калійным рынку Бангладэш перавысіла 40 %.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# У СЛУЦКУ ПАЧАЛІ ВЫПУСКАЦЬ КРАНЫ-ВОЛАТЫ

## Такога абсталявання ў свеце — адзінкі

**У Слуцку ААТ «БЕЛАЗ»— кіроўная кампанія «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ» рэалізавала ўнікальны праект па вытворчасці маставых кранаў на тэрыторыі адкрытага акцыянернага таварыства «Кранавы завод». Прадпрыемства будзе выпускаць тэхніку грузападымальнасцю да 240 тон. У свеце налічваюцца адзінкі такіх вытворчасцяў.**

Для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта была праведзена маштабная мадэрнізацыя. Плошча новага цэха — 6,4 тысячы квадратных метраў. У выніку аб'ём вытворчых плошчаў прадпрыемства павялічыўся на 20 %.

У адкрыцці цэха прынялі ўдзел старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч, міністр прамысловасці Павел Уцюпін, намеснік старшыні Мінаблвыканкама Мікалай Рагашчук.

— Сёння свята не толькі для працаўнікоў завода, але і для жыхароў Слуцка, — адзначыў спікер верхняй палаты беларускага парламента, які, дарэчы, з'яўляецца яшчэ і старшынёй назіральнага Савета «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ». — Створана каля 40 новых рабочых месцаў для спецыялістаў высокай кваліфікацыі. Толькі за некалькі апошніх гадоў у вытворчасць укладзена 15 мільёнаў еўра інвестыцый. Гэта дазволіла не толькі пабудаваць новы цэх, але і сур'ёзна мадэрнізаваць дзеючую вытворчасць, каб выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю для ўнутранага рынку і на экспарт. Сродкі пайшлі на навучанне кадраў, у тым ліку і за мяжой, на закупку высокатэхналагічнага абсталявання, новых сучасных станкоў ад вядучых еўрапейскіх пастаўшчыкоў, што дазваляе працаваць больш прадукцыйна, а персаналу атрымліваць належную зарплату.

— Вы можаце ганарыцца вынікамі сваёй працы, таму што каля 30 адзінак абсталявання ўстаноўлена, змантавана і фактычна запускаецца на Беларускай атамнай станцыі. Я асабліва падкрэсліваю гэты факт, таму што на такіх аб'ектах высокі ўзровень патрабаванняў да якасці абсталявання і кантролю за яго работай, — звярнуўся да кіраўніцтва завода і рабочых Міхаіл Мясніковіч. — Часам даводзіцца чуць: вы закончылі мадэрнізацыю на гэтым заводзе? Лічу, гэта няправільная пастаноўка пытання. Калі прадпрыемства хоча жыць, працаваць і канкурыраваць на знешніх рынках, яно павінна пастаянна мадэрнізавацца тэхнічна, удасканальваць маркетынг.

Па словах міністра прамысловасці Паўла Уцюпіна, адкрыццё новай вытворчасці — гэта знакавая падзея для ўсёй прамысловасці Беларусі. Тут будуць выпускаць якасную і больш танную прадукцыю, пашырыцца яе асартымент. За пяць месяцаў выпушчана абсталявання на 3 мільёны 600 тысяч рублёў. Да канца 2019 года з улікам новых магутнасцяў гэты паказчык складзе 15 мільёнаў рублёў. Аб'ёмы вытворчасці павялічацца пыблізна ў тры разы, а ў наступныя гады — на 20—30 %. Будуць вырабляцца краны ад 5 да 240 тон. Гэтае абсталяванне пойдзе на «БЕЛАЗ», «Беларуськалій», «Слаўкалій», ёсць заказы на экспарт.

Рэалізацыя праекта дазволіць максімальна лакалізаваць вытворчасць — да 75 %. Гэта значыць, выраблядзь абсталяванне будуць «пад ключ», ад распрацоўкі ідэі да мантажу гатовай прадукцыі, што дасць магчымасць знізіць залежнасць ад сумежнікаў, павысіць наменклатуру мадэляў грузападымальнай тэхнікі, якасць прадукцыі, прадукцыйнасць працы, канкурэнтаздольнасць прадпрыемства на ўнутраным рынку.

— Выпуск магутных кранаў вельмі запатрабаваны ў Беларусі. Раней даводзілася закупляць грузападымальную тэхніку за мяжой, — адзначыў дырэктар Слуцкага кранавага завода Уладзімір Дземідовіч. — Але нашы краны не будуць саступаць імпартным аналагам. Між іншым, яны будуць каштаваць танней, чым замежныя ўзоры. Заціkаўленыя ў набыцці кранаў расіяне, а еўрапейскі сертыфікат якасці дазволіць прадаваць абсталяванне ў краіны Еўропы.

Дадам, што з пункту гледжання нацыянальнай эканомікі праект з'яўляецца эфектыўным, бо ў выніку яго рэалізацыі будзе арганізавана імпартазамяшчальная вытворчасць кранаў вельмі высокай грузападымальнасці.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ЭФЕКТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Хацелася б, каб беларуская дэлегацыя была дастаткова актыўная, каб выступленні былі канструктыўныя, цікавыя, каб тыя пытанні, якія сапраўды стаяць па парадку дня, былі ўзнятыя і каб выступоўцы прапаноўвалі варыянты іх вырашэння, — звярнуўся да ўдзельнікаў аргкамітэта **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**.

У якасці прыкладу ён прывёў пытанне адмены роўмінгу, для вырашэння якога было ўжо шмат зроблена, але пакуль безвынікова.

Кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента заўважыў: актуальнасць форуму абумоўленая тым, што ён адбываецца на фоне абмеркавання на самым высокім узроўні пытанняў паглыблення інтэграцыі Беларусі і Расіі. «Таму ўсе ўдзельнікі дэлегацыі і кіраўнікі секцый павінны быць дастаткова інфармаваныя і мець пэўную пазіцыю па дадзеным пытанні», — сказаў ён.

Як ужо паведамлялася, асаблівасць сёлетняга форуму — шырокі і адмысловы ўдзел у ім моладзі. Дарэчы, яна збярэцца ў Санкт-Пецярбургу раней: 15 ліпеня стартуе Расійска-беларускі маладзёжны форум, 16 ліпеня пройдзе пасяджэнне Савета Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Пасля гэтага ніхто з гасцей не раз'едзецца, бо 17 ліпеня моладзь возьме ўдзел у Экспертнай сесіі, прысвечанай прыярытэтам развіцця Саюзнай дзяржавы.

Міхаіл Мясніковіч выказаў спадзяванні на высокую якасць работы маладзёжнага форуму. «Гэта новая з'ява ў рабоце Форуму рэгіёнаў, і яна павінна прайсці не фармальна, — сказаў ён. — Маладзёжная палітыка ў рамках Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, я лічу, — адзін з самых прыярытэтных кірункаў, бо моладзь дастаткова амбіцыйная, падымае актуальныя пытанні, і мы ўсе, хто займае пэўныя службовыя пасады, павінны адпавядаць патрабаванням маладзёжнага асяроддзя. Сёння ў моладзі іншыя магчымасці, яна не абмяжоўваецца рамкамі дагаворных адносін, мае шырокі доступ да крыніц інфармацыі і мае права выбіраць і від дзейнасці, і месца вучобы, і месца жыхарства».


Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі дадаў, што хацелася б, каб тыя саюзныя адносіны, якія ў Беларусі з Расіяй фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў, былі атрыманы ў спадчыну маладым пакаленнем. «Гэта каштоўнасць, якую мы павінны захаваць. Мы павінны садзейнічаць таму, каб усё добрае, што ў нас ёсць, множылася і было здабыткам моладзі», — рэзюмаваў ён.

Афіцыйная дэлегацыя нашай краіны складае каля 250 чалавек.

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, сустаршыня аргкамітэта Мар'яна ШЧОТКІНА** адзначыла высокую ступень гатоўнасці беларускага боку да форуму.

Яна паведаміла журналістам, што ўжо цяпер вялікую цікавасць выклікае Экспертная сесія, на шасці секцыях якой будуць абмяркоўвацца пытанні агульнай адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы, фарміраванне культурна-гуманітарнай сферы, пытанні турызму і супрацоўніцтва рэгіёнаў.

— Вельмі важнае мерапрыемства — пашыранае пасяджэнне нацыянальных дзелавых саветаў, якое арганізуюць расійская і беларуская гандлёва-прамысловыя палаты з удзелам бізнес-суполак, — лічыць віцэ-спікер. — І канешне, пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі і Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. На ім будуць разгледжаны два асноўныя пытанні: вынікі выканання рашэнняў V Форуму Рэгіёнаў, які праходзіў летась у Магілёве, і развіццё транспартнага патэнцыялу, мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы.

Вынікі, да якіх прыйдуць удзельнікі форуму, будуць агучаныя 18 ліпеня на Пленарным пасяджэнні, тэма якога — «Міжрэгіянальныя сувязі як аснова фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы народаў Беларусі і Расіі». Плануецца, што гэтая цэнтральная падзея важнага саюзнага мерапрыемства пройдзе з удзелам кіраўнікоў дзяржаў.

Адначасова на форуме традыцыйна будуць падпісаны пагадненні паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі, паміж суб'ектамі Расійскай Федэрацыі і ўрадам Беларусі, а таксама камерцыйныя кантракты. Акрамя таго, для ўдзельнікаў форуму прадугледжаны экскурсійная і культурная праграмы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## У тэму

**Менавіта на Форуме рэгіёнаў некалькі гадоў таму ўпершыню прагучала ідэя зрабіць мабільную сувязь паміж Расіяй і Беларуссю больш даступнай. У чэрвені 2017 года Вышэйшым Дзяржсаветам Саюзнай дзяржавы было дадзена даручэнне галіновым міністэрствам Беларусі і Расіі прапрацаваць пытанне аб адмене роўмінгу паміж дзвюма краінамі.**

«І ў Расійскай Федэрацыі, і ў Рэспубліцы Беларусь адразу пачалі працаваць над гэтым, — запэўніваў вясной гэтага года **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА.** — Першай стадыяй было непрымание гэтай задачы. Асабліва былі супраць некаторыя прадстаўнікі міністэрстваў сувязі, бо гэта закранала эканамічныя інтарэсы гульцоў рынку. Аднак грамадская думка і рашэнне Форуму рэгіёнаў адыгралі сваю ролю. Сёння ёсць разуменне неабходнасці адмены роўмінгу і ідуць дыскусіі адносна таго, як гэта зрабіць тэхнічна».

Рыгор Рапота паведамляў, што рыхтуецца дарожная карта па выкананні гэтага рашэння, і, як толькі яна будзе гатовая, можна будзе казаць пра тэрміны вырашэння пытання.

**Намеснік міністра лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расіі Алег ІВАНОЎ** пацвердзіў, што яго ведамства распрацавала і накіравала беларускім калегам дарожную карту, якая прадугледжвае тры этапы адмены роўмінгу і магчымае іх завяршэнне ўжо ў 2019 годзе. Па словах намесніка міністра, структурна дарожная карта была падтрымана беларускім бокам, аднак канчатковая згода паміж профільнымі ведамствамі так і не была дасягнутая. «Пытанне чакае палітычнага рашэння на больш высокім узроўні, — Алег Іваноў. — Па выніках атрымання неабходных дырэктыў ад урадаў дзвюх краін работа будзе працягнутая».

У сваю чаргу, **міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі Канстанцін ШУЛЬГАН** падкрэсліваў, што варыянты адмены роўмінгу паміж Беларуссю і Расіяй будуць прапрацоўвацца да таго часу, пакуль бакі не прыйдуць да ўзгодненай пазіцыі. «Першыя варыянты ўжо ёсць. Аднак варта ўлічваць, што гэтае няпростае пытанне ў Еўрасаюзе вырашалася больш за сем гадоў», — казаў ён.

Па словах міністра, беларусаў, якія знаходзяцца ў роўмінгу, — каля аднаго мільёна, расіян — пяць мільёнаў.

Днямі Рыгор Рапота паведаміў у праграме тэлеканала «Беларусь 1», што пытанне з роўмінгам застаецца ў прапрацоўцы. «Мяне, вядома, засмучае тое, што яно так павольна рухаецца, але радуе, што яно ўсё ж такі рухаецца, — прызнаўся ён. — Мы зрабілі пэўны крок ад нежадання наогул гэтым займацца да таго, як гэта зрабіць. Гэта вялікі прагрэс. Ёсць жаданне вырашыць праблему».

Ён дадаў, што Форум рэгіёнаў — эфектыўная форма міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, бо на ім збіраюцца прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі і Беларусі і абмяркоўваюць сумесныя праекты. На такіх сустрэчах падымаюцца агульныя пытанні саюзнага будаўніцтва, у тым ліку адмены роўмінгу і тэлефонных размоваў, пашырэння навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння.

«Мы вельмі ўважліва прыслухоўваемся да парад, якія там гучаць», — запэўніў Рыгор Рапота.

# АГУЛЬНЫЯ ЗОРКІ

## Да 75-годдзя Перамогі помнікі і памятныя месцы Саюзнай дзяржавы атрымаюць QR-коды

Маладзёжная палата пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі запускае міжнародны праект «Лічбавая зорка», на працягу якога будзе адлічбаваная інфармацыя пра помнікі і месцы буйных бітваў савецкіх войскаў на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў БелТА паведаміў **старшыня палаты Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

«Плануецца, што падчас акцыі клубы рэканструктараў сумесна з маладымі гісторыкамі і валанцёрамі будуць шукаць інфармацыю пра жыццё і подзвігі герояў, пра памятныя месцы, асабліва на перыферыі рэгіёнаў. Падрыхтуем адпаведную карту. Прачытаць звесткі дапаможа QR-код, магчыма будзе і самастойна зарэгістраваць аб'ект, знайсці дадатковую інфармацыю дзякуючы архівам», — растлумачыў дакладчык.

Ён нагадаў таксама, што ў Саюзнай дзяржаве распрацаваны праект стратэгіі развіцця маладзёжнай інтэграцыі, і пазнаёміў з вынікамі конкурсу па стварэнні эмблемы моладзі Саюзнай дзяржавы, прадставіўшы выяву-пераможцу.

Па словах Аляксандра Лук'янава, у конкурсе ўдзельнічала звыш сарака эскізаў ад больш чым трыццаці аўтараў. Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца на пасяджэнні Савета Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе саюза Беларусі і Расіі, які ўпершыню пройдзе падчас маладзёжнага форума на VI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу на наступным тыдні.

Старшыня Маладзёжнай палаты паведаміў, што саюзная моладзь прапанавала Парламенцкаму сходу канцэпцыю развіцця вытворча-адукацыйных кластараў на базе Аршанскага ільнокамбіната.




«Найбуйнейшы ў Еўропе і на тэрыторыі постсавецкай прасторы камбінат цесна супрацоўнічае з Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам, у той час як у Расіі стаіць задача па мадэрнізацыі цяперашняй ільновытворчасці. Чаму моладзь прыгранічча не прывозяць на стажыроўку, на практыку да нас?» — разважае Аляксандр Лук'янаў.

**Намеснік старшыні Маладзёжнай палаты Ягор МАКАРЭВІЧ** адзначыў, што ў далейшай дзейнасці плануецца зрабіць акцэнт на развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў эканоміцы.

«На пасяджэнні Савета МПСД прадставім і пытанні развіцця маладзёжнага турызму, бо развіваць інтэграцыю можна толькі пры ўмове, што маладыя людзі з Беларусі і Расіі ведаюць і наведваюць знакавыя гістарычныя, культурныя месцы, месцы для вольнага часу абедзвюх дзяржаў», — перакананы Ягор Макарэвіч.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, член Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Людміла МАКАРЫНА-КІБАК** выказала ўпэўненасць, што галоўная задача, якую павінна вырашаць моладзь, — прасоўванне Саюзнай дзяржавы.

«Да таго ж яны павінны навучыцца быць добрымі людзьмі і ў далейшым, можа, і добрымі кіраўнікамі. Да такой работы трэба рыхтавацца загадзя: дэпутат — гэта не работа, а нават лад жыцця», — адзначыла Людміла Макарына-Кібак.

Як нагадала дэпутат, Маладзёжная палата сфарміравaная год таму. Яна складаецца з сарака чалавек — па дваццаць грамадзян з кожнай краіны. У Беларусі дзейнічае закон аб маладзёжнай палітыцы, у Расіі падобнага дакумента няма. Таму, як лічаць парламентарыі, ключавы момант стратэгіі развіцця маладзёжнай інтэграцыі — набліжэнне заканадаўстваў краін.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ПО ДОРОГЕ К ОБЩЕМУ

## Беларусь — от транспортного коридора

**Белорусские парламентарии продолжают подготовку к главному союзному событию лета — Форуму регионов Беларуси и России. Подключилось к работе и научное сообщество. В Национальной академии наук провели круглый стол «Развитие транзитного потенциала и модернизация транспортной инфраструктуры Союзного государства». Предложения участников заседания (среди которых были сенаторы, ученые, работники министерств, представители бизнес-сообществ) планируют вынести на обсуждение на форуме и после закрепить в итоговом документе.**



### Задачи для ВВП

Модератором круглого стола выступил **Александр ПОПКОВ, председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению.** Во вступительном слове он обратил внимание, что перед Беларусью и Россией сегодня стоит задача удвоения ВВП. «Мы понимаем, что от скоординированности с другими отраслями народного хозяйства во многом будет зависеть успех и результативность нашей с вами работы. Транспортный комплекс, к сожалению, если посмотреть, в структуре валового внутреннего продукта нашей страны занимает небольшой процент, порядка 5—6 %. Это не столь много. Но если говорить об удвоении (это как отрасль народного хозяйства), мы должны возлагать особые надежды и хотя бы десяток процентов от транспортного комплекса иметь. Это сегодня вопросы и железнодорожного транспорта, и авиа-, грузоперевозок, и так далее», — отметил Александр Попков.

Во время круглого стола, как подчеркнул модератор, нужно прийти к конкретным предложениям по развитию обсуждаемых направлений: «Речь идет, прежде всего, о соответствующей законодательной базе, которая должна присутствовать в Союзном государстве. Мы должны подумать о соответствующей инфраструктуре, что для этого нужно».

С первым докладом выступил главный куратор данной отрасли — **министр транспорта и коммуникаций Алексей АВРАМЕНКО.** По его мнению, потенциал сферы может быть значительно увеличен при рациональном использовании преимуществ, предусмотренных Договором о создании Союзного государства.

В 2018 году в сообщении Китай—Европа было перевезено порядка 325 тысяч контейнеров поездами, к 2025 году эту цифру планируют увеличить до 1 миллиона. На условиях государственно-частного партнерства в текущем году начнут реконструкцию автомобильной дороги «граница Российской Федерации — Гомель — Кобрин», которая позволит сократить расстояние перевозок грузов в направлении «Азия—Россия—Беларусь—Европа» на 150—200 километров. Амбициозным проектом белорусских транспортников является реконструкция аэропорта. Отметил Алексей Авраменко недостаточное количество межрегиональных авиарейсов между Беларусью и Россией. В Минск жители регионов соседней страны сегодня летают в основном через Москву.

«В последние годы в Беларуси проводится работа по автоматизации процессов на основе перевода информации в цифровой формат. Создаются различные автоматизированные системы. В таможенных органах применяется программное обеспечение, позволяющее автоматизировать процедуру обработки информации по товарам, перемещаемым через автодорожные пункты таможенного оформления из Беларуси в Россию и обратно, — сообщил министр транспорта. — Комплексные работы по цифровизации транспортной системы проводятся в Российской Федерации. Предлагаю в области цифровизации синхронизировать действия Республики Беларусь и России, чтобы в дальнейшем не проводить работы по ее унификации».

Создание единого транспортного пространства предполагает снятие барьеров на пути товаров и увеличение объемов перевозок. Наибольших успехов в Союзном государстве в этом плане достигли железнодорожники, которым удалось создать единого оператора на базе транспортно-логистической компании.

«Однако дальнейшее развитие транспортного потенциала государств сдерживается наличием определенных барьеров, преграждающих доступ белорусских автомобильных перевозчиков на рынок транспортных услуг, — это отсутствие возврата НДС за топливо, ограниченное страховое покрытие по «Зеленой карте», большое количество остановок для проверки документов. Наличие разрешительной системы для осуществления перевозок из третьих стран, отслеживание принципа резидентства при таможенном оформлении грузов из третьих стран, большие потери времени при пересечении границы транзитным сообщением, наличие сборов, взимаемых с перевозчиков по решению местных органов управления, досмотры грузов, перевозимых в опечатанных транзитных контейнерах, различные уровни налогообложения и валютного регулирования поставщиков автотранспортных и экспедиторских услуг», — перечислил Алексей Авраменко.

Настаивает министр на увеличении количества уполномоченных экономических операторов, которые способствуют облегчению транспортного взаимодействия двух стран.

К слову, ставку транспортное ведомство сегодня делает не на промышленные предприятия, а на создание транспортных услуг.

### Мнение ученых

«Транспорт в его широком понимании (от средств передвижения — авиации, автомобилей, поездов и других — до линий электросвязи и трубопроводов) — реальный двигатель экономики, который должен служить целям включения страны в глобальный оборот товаров, работ и услуг. В этом ученые видят дальнейший рост экономики нашей страны, который может быть обеспечен только при совместном скоординированном действии всех заинтересованных сторон в рамках корпоративного подхода», — подчеркнул **председатель президиума Национальной академии наук Беларуси Владимир ГУСАКОВ.**

Ученые Беларуси сегодня подключаются к мегапроекту российских коллег «Единая Евразия» по созданию пространственных транспортно-логистических коридоров на территории России. Они будут соединять азиатско-тихоокеанский регион и Европейский союз, что решит проблему комплексного освоения Сибири, Дальнего Востока, Арктики.

«Мегапроект должен стать стартовой точкой на пути масштабных преобразований экономики России и Беларуси по опережающему росту, достижению целей устойчивого развития наших государств, равноправному, а в отдельных областях лидирующему включению в глобальные цепочки формирования добавленной стоимости»,— рассказал Владимир Гусаков.

Он уверен, что Беларусь должна стать не просто транспортным коридором, а инфраструктурным центром, который будет регулировать товарно-транспортные потоки во все стороны света.

«Принципиальная позиция ученых: реализация мегапроекта должна осуществляться на подлинно кооперативных началах, означающих равноправие партнеров, сложение их сильных сторон, солидарное разделение выгод и рисков. В этом ключе важно предъявить и закрепить фундаментальные основы кооперации наших стран. Это соответствие политическим и социально-экономическим целям развития государств, взаимная заинтересованность сторон в развитии конкретного приоритетного научного направления, соответствие мировым тенденциям научно-технического прогресса», — обратил внимание руководитель НАН.

— Мы плануем падпісаць два кантракты, — паведаміў карэспандэнту «МС» **генеральны дырэктар ААТ «Магілёўхімвалакно» Пётр РУДНІК.** — Адзін з ТАА «Авангард» з Санкт-Пецярбурга на пастаўку ў наступным годзе поліэфірнага валакна на суму пяць мільярдаў расійскіх рублёў. А другі з яшчэ адным прадпрыемствам Санкт-Пецярбурга на пастаўку нашых тэхнічных нітак на суму 0,5 мільярда расійскіх рублёў. Акрамя гэтага, на Форуме ў Санкт-Пецярбургу намечаны шэраг сустрэч з іншымі спажыўцамі нашай поліэфірнай прадукцыі — будзем пашыраць рынкі збыту. Каардынацыйная роля гэтага Форуму паміж нашымі і расійскімі рэгіёнамі вельмі вялікая. Дамоўленасць ідзе на ўзроўні губернатараў, якія там усталоўваюць умовы для інвестыцый, прагаворваецца эканамічнае і іншае супрацоўніцтва. На падставе міжрэгіянальных дакументаў, якія падпісваюцца на Форуме, ідзе напаўненне канкрэтыкай. На сёння мы супрацоўнічаем прыкладна з 30 краінамі, 95 % нашай поліэфірнай прадукцыі ідзе менавіта на экспарт.

Вялікія спадзяванні на Форум ускладаюць народныя абраннікі.

— Едзем на сустрэчу з расійскімі калегамі, каб прааналізаваць, што зроблена, і абазначыць новыя кірункі супрацоўніцтва, — кажа **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.** — Плануем падпісаць план мерапрыемстваў са Смаленскай вобласцю па супрацоўніцтве ў рамках раней падпісаных пагадненняў. Аналагічны дакумент збіраемся падпісаць і з калегамі з Самарскай абласной Думы. Сёлета мы актыўна займаліся развіццём нашых адносін і практычнай рэалізацыяй тых пагадненняў, якія былі падпісаныя ў рамках мінулага Форуму. У гэтым мы добра прасунуліся наперад з Краснадарскім краем. У Санкт-Пецярбургу сустрэнемся з прадстаўнікамі заканадаўчых сходаў, з якімі ў нас падпісаны планы мерапрыемстваў. Пляцоўка Форуму добра дапамагае актывізаваць узаемадзеянні паміж нашымі народамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Самарскія дэпутаты пасябруюць з гамяльчанамі

**Дэлегацыя Гомельскай вобласці, якую ўзначаліць старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч, 16—18 ліпеня 2019 года возьме ўдзел у VI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў Санкт-Пецярбургу.**

Падчас яго будзе падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў і Самарскай Губернскай Думай. Акрамя таго, адбудуцца сустрэчы з расійскімі калегамі Курскай, Бранскай, Варонежскай і Арлоўскай абласцей у сферах спорту і турызму, адукацыі, бібліятэчна-інфармацыйнай і культурнай дзейнасці.

Падчас падрыхтоўкі і ў межах Форуму прадпрыемствы вобласці плануюць падпісаць з расійскімі партнёрамі экспартных кантрактаў на агульную суму 93 мільёны долараў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Курск стане бліжэйшым

## На VI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі кіраўніцтва Віцебскай вобласці падпіша шэраг важных дакументаў

Тое ж будзе зроблена і на ўзроўні асобных рэгіёнаў, устаноў. Як паведамілі ў камітэце эканомікі Віцебскага аблвыканкама, губернатар Мікалай Шарснёў падпіша пагадненне з адміністрацыяй Курскай вобласці аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве. У планах і падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве паміж Гарадоцкім раёнам і Прэфектурай Паўночна-Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы.

У складзе афіцыйнай дэлегацыі з Прыдзвіння будзе старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, старшыні некалькіх райвыканкамаў, кіраўнікі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік».

Больш за трыццаць кантрактаў у скарбонцы Віцебшчыны на пастаўку прадукцыі прадпрыемстваў вобласці ў розныя рэгіёны Расіі. Агульная сума здзелак складае ў эквіваленце 46 мільёнаў долараў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Наша гісторыя

## Брэсцкая крэпасць замацоўвае кантакты з музеямі Масквы і Валгаграда

Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» плануе заключыць дагаворы аб супрацоўніцтве з двума расійскімі музеямі на будучым Форуме рэгіёнаў. Пакуль што доўгатэрміновы дагавор аб супрацоўніцтве крэпасць мае толькі з Музеем Перамогі ў Маскве. Дарэчы, дакумент падпісалі летась на Санкт-Пецярбургскім міжнародным культурным форуме. А цяпер падрыхтаваны пакет дакументаў на дагаворы з музеем-панарамай «Барадзінская бітва» ў Маскве і гісторыка-мемарыяльным музеем-запаведнікам «Сталінградская бітва» ў Валгаградзе.

— Мэтай пагадненняў вызначылі пашырэнне доступу наведвальнікаў да гістарычнай спадчыны дзвюх краін, прыцягненне турыстычных патокаў у кожны з музеяў, — расказала **намеснік дырэктара Брэсцкай крэпасці Ларыса БІБІК.** — Пасля заключэння дагавораў стануць рэальнасцю сумесныя выставачныя праекты, удзел музейных работнікаў у навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, іншых мерапрыемствах. І для любога наведвальніка экспазіцыі ў любой з краін будуць несумненныя плюсы. Скажам, зазірнуў у Музей абароны крэпасці і пазнаёміўся з гісторыяй Барадзінскай бітвы альбо сталінградскай эпапеі. Тое ж самае і для турыста ў Маскве альбо Валгаградзе — з'явіцца магчымасць дакрануцца да гісторыі першых дзён вайны і абароны Брэсцкай крэпасці.

Прыклады паспяховага супрацоўніцтва Брэста з калегамі ўжо ёсць. Год таму ў Музеі абароны адкрылася выстаўка «Бессмяротны горад нашай славы» з фондаў Дзяржаўнага музея гераічнай абароны і вызвалення Севастопаля. У адказ у гэтым горадзе таксама адкрылася выстаўка, прысвечаная 180-гадовай гісторыі крэпасці над Бугам. Нашы музеі запатрабаваныя ў грамадзян абедзвюх краін. Пра гэта сведчыць наступны факт: у маі гэтага года мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» ушанаваў 25-мільённага наведвальніка. Ім стала масквічка Марыя Васіна, якая прыехала з сям'ёй на экскурсію ў Брэст.

Папярэдняя дамоўленасць аб заключэнні пагадненняў была дасягнутая ў красавіку на сумеснай калегіі міністэрстваў культуры Расіі і Беларусі. Паводле інфармацыі **дырэктара мемарыяльнага комплексу, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Рыгора БЫСЮКА,** менавіта расійскія калегі прапанавалі замацаваць дагаворамі сумесныя праекты, якія павінны набыць пастаянны характар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# З канкрэтнымі прапановамі

Дэлегацыя Мінскай вобласці прыедзе ў Санкт-Пецярбург з канкрэтнымі мэтамі і прапановамі. З расійскім бокам дасягнуты папярэднія дагаворы аб правядзенні падчас Форума сустрэч старшыні Мінаблвыканкама Анатоля Ісачанкі з выканаўцам абавязкаў губернатара Арэнбургскай вобласці Дзянісам Паслерам і губернатарам Бранскай вобласці Аляксандрам Багамазам, кіраўніком адміністрацыі Калінінскага раёна Санкт-Пецярбурга Васілём Панідзелкам.

У межах мерапрыемства вызначаны і плануюцца да падпісання міжрэгіянальныя дакументы, у прыватнасці пагадненне паміж Мінаблвыканкамам і ўрадам Арэнбургскай вобласці аб ажыццяўленні міжнародных і знешнеэканамічных сувязяў у сферах гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і сацыяльна-гуманітарнага супрацоўніцтва, а таксама пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінскім абласным Саветам дэпутатаў і Заканадаўчым Сходам Свярдлоўскай вобласці.

У працэсе падрыхтоўкі і правядзення Форума арганізацыямі Мінскай вобласці заключаны і плануюцца да заключэння кантракты ў памеры 51,5 мільёна долараў ЗША. Найбольшыя сумы кантрактаў — у адкрытых акцыянерных таварыстваў «Здравушка-мілк», «Слуцкі сыраробны завод», «Агракамбінат «Дзяржынскі», сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Лекфарм».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# КЛЮЧАВЫ ІГРОК,

## або Ці гатовы Ніжні Ноўгарад прыняць наступны Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі?



Фота з сайта ўрада Ніжагародскай вобласці.

**На сённяшні дзень Ніжагародская вобласць з'яўляецца адным з найважнейшых гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі. Штогод тавараабарот паміж бакамі вар'іруецца ў межах мільярда долараў. Безумоўна, галоўнымі гульцамі ў гэтых адносінах выступаюць галіны машынабудавання і атамнай энергетыкі. Першы намеснік старшыні ўрада Ніжагародскай вобласці Яўген ЛЮЛІН расказаў пра выйкі двухбаковага супрацоўніцтва і планы ў перспектыве прыняць Форум рэгіёнаў на ніжагародскай зямлі.**

— Для Расіі і нас, ніжагародцаў, няма бліжэй народа, чым беларусы. Гэта выяўляецца не толькі ў словах, а ва ўсіх нашых адносінах: эканамічных, палітычных, культурных, асветніцкіх, — падкрэсліў віцэ-губернатар на сустрэчы з беларускімі і расійскімі журналістамі супольнасці «Друзья — Сябры». — Пагадненне, якое падпісана паміж Ніжагародскай вобласцю і Рэспублікай Беларусь, вельмі змястоўнае: яно з'яўляецца ключавым у развіцці нашых знешнеэканамічных адносін.

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што Ніжагародская вобласць на сённяшні дзень гандлюе з 139 краінамі свету, і першае месца сярод іх займае Рэспубліка Беларусь: знешнегандлёвы абарот штогод складае амаль мільярд долараў ЗША.

— Гэта, паверце, не выпадковасць і не старыя савецкія ўзаемаадносіны, гэта намаганні двух народаў па рэалізацыі сумесных праграм, — запэўніў ён. — Я добра памятаю, калі на самым пачатку шляху (гэта было больш за 15 гадоў таму) мы марылі пра 500 мільёнаў долараў як пра амаль нязбытную мэту. І да гэтага імкнуліся разам. Тым не менш сёння мы маем мільярд, і я ўпэўнены, што перспектыва ў нас яшчэ большая.

Яўген Люлін расказаў, што бакі ўзаемадзейнічаюць у рамках Савета дзелавога супрацоўніцтва Ніжагародскай вобласці і Беларусі. Дарэчы, яго з беларускага боку доўгі час узначальваў цяперашні Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзімір Сямашка. З расійскага — губернатар урада Ніжагародскай вобласці.

— Самае галоўнае, што мы даўно прывыклі абмяркоўваць і вырашаць пытанні адным тэлефонным званком. Я думаю, у гэтым і быў залог поспеху, калі мы вельмі дынамічна развіваліся, — адзначыў Яўген Люлін.

Дарэчы, бакі рэалізуюць досыць вялікую колькасць праектаў, сярод якіх ключавымі з'яўляюцца супрацоўніцтва машынабудаўнічых прадпрыемстваў абедзвюх краін, у тым ліку па вытворчасці аўтакампанентаў для мадэльнай лінейкі Групы ГАЗ беларускімі прадпрыемствамі холдынга «Аўтакампаненты», а таксама будаўніцтва БелАЭС ніжагародскай кампаніяй АСЭ (інжынірынгавы дывізіён дзяржкарпарацыі «Расатам»), якая выступае генеральным праекціроўшчыкам і падрадчыкам БелАЭС у Астраўцы.

Сёлета Савет дзелавога супрацоўніцтва Ніжагародскай вобласці і Рэспублікі Беларусь прымае расійскі бок, дата візіту ўзгадняецца.

— Паколькі я не адзін год удзельнічаю ў інтэграцыйных працэсах, упэўнены, што гэта будзе чарговы крок па паглыбленні развіцця нашых узаемаадносін, — падкрэсліў Яўген Люлін.

Варта сказаць, што па выніках 2018 года сума ўзаемнага тавараабароту крыху знізілася і склала 950 мільёнаў долараў, у той час як у 2017 годзе яна перавысіла мільярдную планку. Нязначнае зніжэнне віцэ-губернатар патлумачыў тым, што ў 2017 годзе былі істотныя ўкладанні расійскага боку ў будаўніцтва БелАЭС, а ў наступным годзе аб'ём паставак і будаўніцтва знізіўся.

— Я баюся, што можа адбыцца падзенне, таму што значная частка ў тавараабароце прыпадае на долю гэтага аб'екта, — сказаў ён. — Нічога падобнага! Мы практычна засталіся на ранейшым узроўні за кошт іншых вытворчасцяў, нягледзячы на тое што чакалі пэўнага зніжэння.

На пытанне аб тым, з чым Ніжагародская вобласць паедзе на Форум рэгіёнаў, Яўген Люлін запэўніў, што партфель праектаў досыць важкі:

— У нас шмат тэм, будзем абмяркоўваць з кожным ведамствам, міністэрствам па сваім профілі: што зроблена, што яшчэ не, куды рухацца далей, — адзначыў ён. — Самы вялікі аб'ём супрацоўніцтва ў Міністэрства прамысловасці. Мінсельгасу таксама ёсць што абмеркаваць. Дарэчы, мы — адны з самых буйных пакупнікоў беларускай сельгастэхнікі, на нашых палях яна займае лідзіруючае месца: трактары, камбайны, прычапная тэхніка і многае-многае іншае. Кожная сустрэча — гэта магчымасць далейшага паглыблення адносін і абмеркавання яшчэ не вырашаных праблем. Калі сабраць разам спіс тэм, па якіх мы будзем працаваць на Форуме, ён атрымаецца вельмі вялікі.

Журналісты звярнулі ўвагу, што пасля першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі гаворка ішла пра тое, што наступны на расійскім баку пройдзе ў Ніжнім Ноўгарадзе, але гаспадарамі прадстаўнічага мерапрыемства рабіліся Сочы, а цяпер вось Санкт-Пецярбург — чаму ж да Ніжняга так і не даедуць?

— Дакладна даедуць, — выказаў упэўненасць суразмоўца. — Улічваючы, што наш рэгіён — адзін з самых актыўных ва ўсіх адносінах з Беларуссю, і ў першую чаргу па эканамічных паказчыках, вядома, даедуць.

Адпаведныя заяўкі падаюцца, адзначыў ён, рашэнне пытання знаходзіцца на міжурадавым узроўні.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
*Ніжні Ноўгарад — Мінск.*

❍ **НАША ДАВЕДКА**

**У рамках пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва, які прайшоў у 2018 годзе, былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Варатынскім муніцыпальным раёнам Ніжагародскай вобласці і Бабруйскім раёнам Магілёўскай вобласці, Вятлужскім муніцыпальным раёнам і Бабруйскім раёнам, аб усталяванні пабрацімскіх сувязяў паміж гарадской акругай горада Першамайск і горадам Барань Віцебскай вобласці.**

❍ У тэму

**Кіраўнік аддзялення ў Ніжнім Ноўгарадзе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Аляксандр УЛАСАЎ** паведаміў, што ў зоне адказнасці рэгіёна знаходзяцца восем расійскіх рэгіёнаў: Уладзімірская, Іванаўская, Кастрамская, Разанская, Тамбоўская, Ніжагародская, Пензенская вобласці і Рэспубліка Мардовія. За перыяд са студзеня да мая бягучага года тавараабарот па ўсіх складаў амаль 530 мільёнаў долараў (тэмп росту ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года 103,7 %). Пры гэтым на долю Ніжагародскай вобласці прыпадае львіная доля — 239 мільёнаў долараў (тэмп росту — 108 %).

# ПРАЦАВАЦЬ НА СЯБЕ

## Робаты для сельскай гаспадаркі

У Беларусі няшмат раённых цэнтраў, дзе адначасова знаходзяцца салідная сельскагаспадарчая ВНУ — Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія — і тэхнапарк. Горкам у гэтым сэнсе пашчасціла.

Горацкі тэхнапарк быў створаны пазалетась і з'яўляецца першым і пакуль адзіным паркам у сістэме Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Ён уключаны ў дзяржпраграму інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады. Першыя два яго рэзідэнты з Расіі і Беларусі з'явіліся летась. Расійская кампанія ТАА «Навукова-тэхнічны цэнтр «БелАграРобат» (заснавальнік — маскоўская кампанія ТАА «НТЦ «РобоПРОБ», рэзідэнт кластара інавацыйнага цэнтра «Сколкава») рэалізуе праект, звязаны з кропкавым земляробствам, і збіраецца забяспечыць беларускі (і не толькі) рынак рабатызаванымі глебавымі пробаадборнікамі. Яшчэ адзін рэзідэнт працуе ў галіне жывёлагадоўлі.

— Наша мадэль рабатызаванага глебавага пробаадборніка зроблена сумесна з аўстрыйскімі калегамі, — прадэманстраваў дэпутатам адну з распрацовак **генеральны дырэктар кампаніі ТАА «Навукова-тэхнічны цэнтр «РобоПРОБ» Уладзімір ЕЛІСЕЕЎ.** — Яна дазваляе непасрэдна на полі на працягу адной гадзіны правесці аналіз глебы і даведацца, колькі спатрэбіцца ўгнаенняў. Цяпер за мяжой існуюць тры асноўныя трэнды: робаты для барацьбы з пустазеллем, для знішчэння шкоднікаў і вызначэння хвароб раслін. За кошт сродкаў інавацыйнага фонду Магілёўскай вобласці і нашых грошай хацелі б зрабіць распрацоўку малога эксперыментальнага сельскагаспадарчага робата для барацьбы з пустазеллем. Аналагічныя даследаванні мы вядзём і ў Расіі, але прыйшлі сюды таму, што ў Беларусі для гэтага вельмі спрыяльная глеба. Нам далі магчымасць весці свае даследаванні на вопытна-эксперыментальным заводзе «Прэма». У нашу каманду ўваходзяць як беларускія, так і расійскія вучоныя.

Датчыкі для кароў Ovi-Bovi, якія дапамагаюць знайсці гатовых для працягнення роду кароў, таксама інавацыйны прадукт. Іх стварыў **беларускі фізік Дзмітрый ШЫРОКІ, дырэктар ПУП «Размеркаваныя сэнсарныя сістэмы»**. Прадукт запатрабаваны жывёлаводамі — штучнае асемяненне каштуе нятанна, а правільна вызначыць час, калі карова «саспела», цяжка. Увагу на праблеме засяродзіла жонка Дзмітрыя, ветэрынар па адукацыі. Маўляў, шмат дзяржаўных грошай на гэта сыходзіць беспадстаўна. І Дзмітрый вырашыў гэтую праблему зняць. На думку распрацоўшчыка, такі падыход дасць магчымасць хутка і якасна ўкамплектаваць фермы жывёлай. Па словах Шырокага, у свеце каля дзесяці буйных вытворцаў такіх датчыкаў. Ён паставіў перад сабой задачу стварыць прадукт, які пераўзыходзіў бы заходнія аналагі па функцыянальнасці і пры гэтым каштаваў танней. Але за яго знаходкай чэргі пакуль што не стаяць. Такія датчыкі ў Беларусі набылі толькі некалькі гаспадарак. У якасці станоўчага прыкладу вучоны прыводзіць той факт, што дзякуючы яго вынаходніцтву адбыўся рост рэпрадукцыйнасці жывёл у СВК «Гарадзея» Нясвіжскага раёна.

Горацкаму тэхнапарку таксама прысвоены статус цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва. У рамках міжнароднай тэхнічнай дапамогі праграмы ПРААН і Мінэканомікі і фінансавай падтрымкі Расійскай Федэрацыі тут рэалізуецца праект па стварэнні бізнес-інкубатара. Ён спрыяе занятасці і самазанятасці насельніцтва ў малых і сярэдніх гарадах, дапамагае людзям, якія хацелі б стаць прадпрымальнікамі, зрабіць першы крок. У перспектыве развіццё адукацыйных праектаў, пачынаючы ад школы барыста і заканчваючы IT-курсамі, якія дапамогуць зарабляць грошы анлайн — аддалена. Плануецца на базе тэхнапарка рэалізаваць кластар прыгажосці, кулінарыі і кластар земляробства і аграэкатурызму. Тэхнапарк таксама займаецца дзіцячым кірункам, запусціў праект па праграмаванні і робататэхніцы.



80 % вырабаў ТАА «Рэмкам» сёння ідзе на экспарт.



## Падвялі вынікі

Пытанне аб прадпрымальніцтве было адным з некалькіх, якія дэпутаты разгледзелі падчас выязнога пасяджэння. Па кожным з іх быў распрацаваны канкрэтны алгарытм дзеянняў.

— Дэпутаты ацанілі ўбачанае станоўча, ёсць добрыя перспектывы, і гэта трэба развіваць, — падвёў вынікі пасяджэння **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК**. — Горкі — горад унікальны перш за ўсё дзякуючы буйной сельскагаспадарчай ВНУ, якая акумулюе моладзь з усёй рэспублікі. І тутэйшы тэхнапарк дазволіць выкарыстаць гэты патэнцыял цалкам. Асабліва цікавая форма дзіцячага тэхнапарка. У цэлым тыя рашэнні, якія ў працэсе абмеркавання падымаліся, патрабуюць далейшага замацавання і прапрацоўкі. Гэта датычыцца і аптымізацыі двух формаў саветаў прадпрымальнікаў, якія зараз існуюць у вобласці і, па сутнасці, дублююць адна адну. Магчыма, лепш пашырыць адзін савет і надаць яму больш паўнамоцтваў, чым утрымліваць два. І прадпрымальнікі ў гэтым зацікаўлены. Разглядаліся таксама пытанні, якія датычыліся карэкціроўкі артыкулаў бюджэту. Дэпутаты падтрымалі прапанову накіраваць значную частку фінансаў на развіццё аховы здароўя — гэта будаўніцтва новай паліклінікі ў Магілёве ў раёне Казіміраўка, завяршэнне рэканструкцыі гарадской радзільні і адкрыццё кардыяхірургічнага цэнтра.

Было прынятае Палажэнне аб Маладзёжным парламенце. З сённяшняга дня мы пачынаем падрыхтоўку да выбараў у яго — плануецца правесці іх у пачатку новага навучальнага года. Большасць нашых калег пайшла па шляху выбрання кандыдатаў на базе школ, а між тым у рэспубліканскі парламент можна дэлегаваць прадстаўнікоў, не маладзейшых за 18 гадоў. Школьнікі, як вядома, пад гэты ўзрост не трапляюць. І мы вырашылі, што раённы і гарадскі ўзровень будзе школьны, а ў абласны парламент змогуць прайсці больш дарослыя кандыдаты ад 16 да 28 гадоў. У абласны маладзёжны парламент вырашана абраць 55 прадстаўнікоў — па колькасці дэпутатаў аблсавета, каб па прыкладзе Мінска замацаваць моладзь за старэйшымі калегамі і каб тыя тлумачылі ім, як і што трэба рабіць. Яшчэ 24 маладыя дэпутаты будуць дэлегаваны ў савет з ліку дзеючых. Выбіраць будзем на чатыры гады, каб малады чалавек меў магчымасць атрымаць нейкі вынік. Таксама зроблена папраўка па размеркаванні сродкаў асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў: яны павінны працаваць, а не ляжаць мёртвым грузам. Па хадайніцтве членаў асацыяцыі яны будуць накіроўвацца на падтрыманне тых ініцыятыў, якія рэалізуюцца з удзелам капіталу саміх жыхароў. На сёння такія заяўкі паступілі з Чавус і Магілёва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,** *г. Горкі.* **Фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## У тэму

**Анатоль ХІШЧАНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— У мэтах рэалізацыі палажэнняў пункта 6 Дэкрэта № 7 сёлета 19 мая прынятыя дапаўненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях — у артыкул за непрыняцце мер па належнай арганізацыі дзейнасці юрыдычнай асобы. Кіраўнік будзе больш адказна ставіцца да культуры вытворчасці, тэхнікі бяспекі на сваім прадпрыемстве, бо няце персанальную адказнасць за неналежную арганізацыю работы.

**Алена КАЛЯСНЁВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Я сама жыву ў Горках, і мне вядомыя прадпрыемствы, якія мы наведалі. За імі будучыня. Разлічваць на тое, што прыйдзе нейкі вялікі бізнес з вялікім капіталам, не выпадае. На ТАА «Рэмкам», напрыклад, працуе шмат выпускнікоў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, людзі маюць вучоныя ступені, закончылі аспірантуру і свае навуковыя распрацоўкі ўкаранілі ў вытворчасць. А індывідуальны падыход, які яны забяспечваюць у рабоце з кліентамі, гэта проста выдатна, за гэтым будучыня.

Тэхнапарк таксама створаны пры ўдзеле супрацоўнікаў Беларускай сельгасакадэміі. Асабліва цікавы і перспектыўны дзіцячы тэхнапарк з яго робатамі і займальнымі навуковымі эксперыментамі. Галоўнае — патлумачыць людзям, з чаго пачынаць бізнес, як правільна раскруціць ідэю. І калі мы жадаем, каб наш унутраны прадукт фарміраваўся перш за ўсё за кошт малога бізнесу і доля яго дасягнула 38—40 %, такія прадпрыемствы павінны быць.



## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», г. Минск, пр-т Партизанский, 174 |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
**Месторасположение — Гродненская обл., г. Гродно, пер. Победы, 5**

| Наименование | Общая пл., кв.м | Инвентарный номер | Назначение | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|---|
| Здание склада | 696,8 | 400/С-25199 | здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 5/1 |
| Составные части: покрытия асфальтобетон. (Б), цементно-бетонное (В), ограждение кирпичное (Г), линия электропередачи (Д) | | | | |
| **Склад (мастерские)** | 921,1 | 400/С-25198 | | 5/3 |
| Составные части: склад(Д1/к), теплоузел(Е1/к) | | | | |
| **Навес** | 294,6 | 400/С-25204 | Здание нежилое | 5/2 |
| Составные части и принадлежности: покрытие асфальтобетонное (Б), ограждение кирпичное (в1, в2), водопроводная сеть (Г) | | | | |
| **Навес** | 122,2 | 400/С-43272 | сооружение неустановленного назначения | 5 |
| **Производственный корпус** | 1528,2 | 400/С-25202 | здание специализир. иного назначения | 5/6 |
| **Административное здание** | 429,1 | 400/С-25203 | здание административно-хозяйственное | 5 |
| Составные части: покрытия асфальтобет. (Б) и цементо-бетон. (В, Г), подпорная стена (Д), ограждения кирпичное (е1, е2) и металлич. (е3, е4), ворота (е5), калитка (е6), водопроводная сеть (Ж), канализационная сеть (И), линия электропередачи (К) | | | | |

**Имущество, входящее в состав лота:** участки многолетних насаждений (инв. № 0000609, 0000610, 0000617), системы тревожной сигнализации (инв. № 47069), охранной (инв. № 0000466) и видеонаблюдения (инв. № 47067), котел стальной твердотопливный КСТБ-95 (инв. № 0000251, 0000250) и КЧУ-7-63А (инв. № 40002)

***Сведения о земельных участках***: пл. **1,4381** га (обременения — сервитут 0,0625 га), **0,2078** га, **0,3867** га (обременения — охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, канализации) предоставлены продавцу для обслуживания зданий и сооружений на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % — 1 599 489,33 бел. руб.**

**Обременения:** площади здания частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 20** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 15.08.2019** в 11. 00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 13.08.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704 92 06. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет аукциона**

| | |
|---|---|
| Лот 1 | **Отделение лифтового узла с боксом разгрузки ценностей** (Вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду) общей площадью 135,9 кв. м, инвентарный номер 200/D-121766, по адресу: г. Витебск, ул. Замковая, 4, пом. 1 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 79 036,77 бел. руб. (снижена на 60 %)**

| | |
|---|---|
| Лот 2 | **Склад с пристройкой гаража на 6 боксов и бытовым блоком** (Здание многофункциональное) общей площадью 332,1 кв. м, инвентарный номер 200/С-39244, по адресу: г. Витебск, ул. Терешковой, д. 11. Составные части и принадлежности: пристройка |

**Сведения о земельном участке:** пл. **0,1302 га** предоставлен продавцу для обслуживания многофункционального здания на праве постоянного пользования.

Ограничения (обременения) прав на земельный участок, расположенный в: охранной зоне магистральных трубопроводов, площадь 0,0063 га; охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0007 га; охранной зоне сетей и сооружений канализации, площадь 0,0001 га; охранной зоне линий электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0039 га; охранной зоне линий электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0005 га; охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0001 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 168 282,81 бел. руб. (снижена на 60 %)**

| | |
|---|---|
| Лот 3 | **1/10 доли в праве собственности на капитальное строение** (Здание административно-хозяйственное) с общей площадью капитального строения 2486,7 кв. м, инвентарный номер 422/С-3271, по адресу: Гродненская обл., г. Щучин, ул. Пушкина, д. 26. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка (Б 1/к), подвал, сушилка, холодная пристройка (б) |

**Сведения о земельном участке:** пл. **0,5681 га,** предоставлен продавцу для содержания и обслуживания административного здания на праве постоянного пользования (доля 1/10)

**Начальная цена с НДС 20 % – 39 288,45 бел. руб. (снижена на 44 %)**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 20.06.2019 г.

**Аукцион состоится 24.07.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.07.2019 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

## Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 19 июля 2019 года 259-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 18.06.2019):

- предмет аукциона № 13 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

Телефон для справок +375 (17) 327 40 22. Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.

УНП 190398583

# ЗАСЛУЖАНАЯ ЎЗНАГАРОДА

**Віцебскі абласны Савет дэпутатаў і аблвыканкам атрымалі Пахвальны водгук у намінацыі «Найлепшы нарматворчы орган».**



Адпаведны конкурс праводзіла Міністэрства юстыцыі Беларусі сярод суб'ектаў, якія ажыццяўляюць абавязковую юрыдычную экспертызу.

Як паведамляюць «Віцебскія весткі» са спасылкай на **начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення юстыцыі аблвыканкама Олію ЧАРЫЕВУ**, конкурс праводзіўся ў першы раз, і тым больш прыемна з ліку 52 удзельнікаў атрымаць такую высокую ўзнагароду. У якасці намінантаў аблвыканкам і аблсавет дэпутатаў былі абраны міністэрскай экспертнай камісіяй.

— Гэтая ўзнагарода — прызнанне нашай працы, — адзначыла Олія Халмірзаеўна. — Нарматворчая дзейнасць — адна з найважнейшых функцый Міністэрства юстыцыі, сярод яе кірункаў — абавязковая юрыдычная экспертыза. Работа з дакументамі карпатлівая, у нейкай ступені манатонная, не кідаецца ў вочы, аднак вельмі важная і патрэбная.

Пахвальны водгук — узнагарода за прафесійныя заслугі вялікай групы людзей, падкрэсліла Олія Чарыева. Эксперты належным чынам ацанілі адказнае стаўленне да справы, кампетэнтнасць, пісьменнасць спецыялістаў абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама, а таксама адпаведнасць складзеных імі нарматыўных прававых актаў устаноўленым крытэрыям.

# НА ДЭПУТАЦКІМ УЗРОЎНІ

**Візіт дэпутата Заканадаўчага сходу Краснадарскага краю Аляксея Цітова ў Магілёў быў спецыяльна прымеркаваны да міжнароднага інвестфоруму «Млын поспеху».**

Аляксей Цітоў — член камітэта па пытаннях прамысловасці, інвестыцый, прадпрымальніцтва, сувязі, спажывецкага і фінансавага рынкаў, знешнеэканамічнай дзейнасці. У Магілёве дэпутат наведаў шэраг прамысловых прадпрыемстваў і перадаў прывітальны адрас абласному Савету дэпутатаў ад старшыні Заканадаўчага сходу Краснадарскага краю Юрыя Бурлачко.

— Нас звязваюць добрыя адносіны з заканадаўчай уладай Магілёўскай вобласці, і мы працягваем гэта супрацоўніцтва, — адзначыў ён. — Форум вельмі карысны. А пасля візіту на вашы прадпрыемствы ёсць жаданне папрацаваць над пытаннем па стварэнні кааперацыі паміж вытворчасцямі Беларусі і Краснадарскага краю. Вельмі зацікавіў вопыт стварэння СЭЗ, у нас такога пакуль няма. Гатовы разглядзець гэта пытанне на заканадаўчым узроўні. Спадзяёмся, што Магілёўская вобласць нам у гэтым дапаможа.

Мацнеюць і сацыяльныя сувязі паміж рэгіёнамі.

— Мы абмеркавалі шэраг пытанняў у развіцці пагадненняў, якія датычацца маладзёжнай палітыкі. У моладзі ёсць жаданне больш актыўна ўдзельнічаць у міжнародным студэнцкім руху, але існуюць пэўныя праблемы з тэхнічнымі момантамі — праездам, пражываннем, харчаваннем. Мы гэта прагаварылі, спадзяёмся на хуткі адказ. Мы, у сваю чаргу, гатовы прыняць моладзь гэтага краю — размясціць, арганізаваць харчаванне — і хацелі б, каб на парытэтных пачатках нашы маладыя людзі паехалі туды, — паведаміў **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.**



**Аляксей ЦІТОЎ *(злева)* перадаў прывітальны адрас старшыні Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Дзмітрыю ХАРЫТОНЧЫКУ.**

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

# Хвала ягадам і працавітым рукам

## У Дварцы прайшло раённае свята «Лунінецкія клубніцы»

**Клубнічная сталіца Дварэц чацвёрты раз стала месцам правядзення раённага фэсту. Яго арганізоўваюць, калі сезон уборкі ўраджаю ягады завяршаецца і гаспадары падводзяць вынікі. Аграгарадок да свята прыхарошваецца і сустракае гасцей выстаўкай-кірмашом майстроў народнай творчасці, а таксама разнастайнымі пачастункамі, галоўныя з якіх — клубнічныя пірагі, мусы, настойкі.**

Паводле дажыначных традыцый, кожны сельсавет разгарнуў на кірмашы ўласны падворак з песнямі, забаўлянкамі, пачастункамі. А пачалі свята з клубнічнага парада, калі па цэнтральнай вуліцы прайшлі працаўнікі ягадных палёў і самадзейныя калектывы. Прывітаць іх на фэст прыйшоў **старшыня райвыканкама Аляксандр ПАЧКО**. Кіраўнік раённай улады нагадаў моладзі, як іх бацькі ў 80-х гадах пачалі вырошчваць ягаду і столькі ўклалі сваёй працы ў справу, што праз дзесяцігоддзі салодкая культура стала брэндам раёна, а Дварэц стаў насіць пачэсны статус клубнічнай сталіцы.


**Вышыванка Алены Капліч з вёскі Лутавень.**

Тут не толькі вырошчваюць ягаду. На ягадныя тэмы пішуць апавяданні і вершы, ствараюць карціны, вышыванкі, пано. На фестывалі падвялі вынікі розных мастацкіх конкурсаў і адзначылі пераможцаў. У лік прызёраў трапілі нават бібліятэкі, якія аформілі адпаведныя куткі. Дарэчы, на свяце ў Дварцы праходзіла кніжная выстаўка. Інтэлектуальнае забеспячэнне і навуковыя падыходы да працэсу вырошчвання ягады надзвычай актуальныя: на дварэ XXI стагоддзе.

Ну і вядома, якое ж свята без песень і танцаў! Цэлы дзень шчыравалі як свае, лунінецкія, артысты, так і калектывы з суседніх раёнаў. А вечарам адбыўся вялікі рок-канцэрт, на яго сабралася вельмі шмат моладзі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


**ТЕХНОБАНК**

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,
Телефон +375 17 283 15 10

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 июля 2019 года**
**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 42 936 | 45 893 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 345 | 337 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 49 030 | 56 631 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 13 950 | 22 914 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 56 836 | 43 218 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 328 611 | 327 027 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 2 | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 24 346 | 24 275 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 4 983 | 5 024 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 4 204 | 3 433 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 89 | 137 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 8 092 | 8 384 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **533 424** | **537 275** |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 43 959 | 54 332 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 381 470 | 385 532 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 32 063 | 26 344 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 10 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 6 803 | 4 484 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **464 295** | **470 702** |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 11 463 | 11 348 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 8 406 | 5 628 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 19 866 | 20 107 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 29 394 | 29 490 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **69 129** | **66 573** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **533 424** | **537 275** |

Форма 2

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках**
**на 1 июля 2019 г.**
**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 12 504 | 10 033 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 6 518 | 7 314 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | | **5 986** | **2 719** |
| | | | | | |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 11 267 | 8 216 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 3 799 | 2 054 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | | **7 468** | **6 162** |
| | | | | | |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 5 | 9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 29 | (81) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 8 103 | 8 462 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (31) | 2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 1 420 | 1 870 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 2 131 | 1 953 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 17 848 | 16 170 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 1 018 | 841 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 3 405 | 345 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 760 | 86 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **2 645** | **259** |

**Председатель Правления** **Д. Ю. Грузицкий**

**Главный бухгалтер** **Н. А. Кузьмицкая**

**Дата подписания: 2 июля 2019 г.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г.
УНП 100706562
Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
**https://tb.by/about/bank/finance/**

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует об изменении процентных ставок по текущим (расчетным) банковским счетам физических лиц в иностранной валюте.

С 16.07.2019 г. процентная ставка по текущим (расчетным) банковским счетам физических лиц в иностранной валюте (вновь открываемым и ранее открытым) устанавливается в размере 0,01 % годовых.

УНП 100325912



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 11 ліпеня 2019 года.**